В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

# 3



ТЭКСТ

СКАЗ

СЛОВА





## Частка 2

В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 2

2-е выданне, перагледжанае і дапоўненае

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2023

УДК 811.161.3(075.2=161.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922
С24

Р э ц э н з е н т

метадычнае аб’яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 131 г. Мінска» (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *Т. В. Шантур*)

**Умоўныя абазначэнні:**

?! — праблемнае пытанне;

Рм — заданне па развіцці маўлення;

— слоўнік;

— дамашняе заданне;

— заданне, якое выконваецца па жаданні;

— інтэрактыўныя заданні на сайце https://eior.by (3 клас, Беларуская мова — Тэма ўрока — кнопка «Дадатковыя матэрыялы»).

ISBN 978-985-893-291-6 (ч. 2)
ISBN 978-985-893-289-3

© Свірыдзенка В. І., 2017
© Свірыдзенка В. І., 2023, са змяненнямі
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2023

# СЛОВА

## СКЛАД СЛОВА

### Прыстаўка

**1.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце спалучэнні слоў.



**выходзяць** з пад’езда



**пераходзяць** дарогу




**падыходзяць** да варот




**заходзяць** у школу

Што аб’ядноўвае выдзеленыя словы? Назавіце ў іх корань. Якімі часткамі адрозніваюцца словы?

Запішыце аднакаранёвыя словы. Знакам ⌐ абазначце часткі, якімі яны адрозніваюцца. Дзе знаходзяцца гэтыя часткі: перад коранем ці пасля яго?

Узор. *Выходзяць, ...*



Спампавана з сайте aversev.by

Частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння слоў, — гэта **прыстаўка.**

**2.** «Падыміцеся па лесвіцы» і ўтварыце пры дапамозе прыставак новыя словы ад прапанаваных.

*па-*
*пра-*
*ад-*
*за-* звінець

*пад-*
*пера-*
*да-*
*вы-* несці

Запішыце аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх прыстаўку і корань. З двума словамі складзіце і запішыце сказы.

**звіне́ць**

**3.** Прачытайце верш. Чаму ён мае такую назву? Ці падобны ён на песеньку? Які настрой можа быць у такой песенькі? Якія словы падказалі вам, што матуля з пяшчотай і любоўю звяртаецца да сына?

## Прачынанка

Сынку-сыночак,
ільняны чубочак,
**пасвары́ся** з со́нікам,
**павітайся** з сонейкам,
бо ўжо пеўнік праспяваў,
каб ты хуценька ўставаў.


Спампавана з сайте aversev.by

З чыстае крыніцы
**прынясу** вадзіцы.
Ты **памыйся**, прыбярыся,
малачка са мной **напі́ся** —
і бяжы сяброў гукаць,
прачынанку ім спяваць.

*В. Літвіновіч.*

**пасвары́ся з со́нікам** — *тут:* прачніся

Выпішыце выдзеленыя словы, вусна падбярыце да іх аднакаранёвыя. Абазначце прыстаўкі ў запісаных словах.

**4.** Прачытайце і запомніце народныя прыкметы. Спішыце. Вусна падбярыце да выдзеленых слоў аднакаранёвыя. Абазначце корань і прыстаўку ў запісаных словах.

На **пагаршэнне** надвор'я паказваюць пчолы, якія **абляпілі** акацыю.

Нечаканы рост грыбоў **прадказвае** дождж.

Словы для даведкі: *адказаў, падказвае; горшы, горш; лепяць, выляпіць.*

### Творчая хвілінка

Якія яшчэ прыкметы змены надвор'я вы ведаеце? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў старэйшых або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.



Спампавана з сайте aversev.by

**5.** Прачытайце, знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Што аб'ядноўвае астатнія словы ў кожнай групе? Запішыце гэтыя словы.

1. Паехаць, палохаць, падумаць, пакруціць.
2. Загадка, заварка, замак, закладка.
3. Нясмелы, нялёгкі, нядрэнны, нядзе́льны.

**нядзе́льны** — які адбыўся ў нядзелю

Абазначце прыстаўку, якая аб'ядноўвае словы кожнай групы.

**6.** Прачытайце верш. На што падобна поле лёну?

## Блакітнае поле

Такое і ў сне не **пабачыце** болей:
ад кветачак ясных — блакітнае поле.
Жыццё тыя кветачкі ў лён **удыхнулі**,
**сабралі** мы лён ды **пашылі** кашулі.

*Л. Багдановіч.*

Спішыце. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах.
❖ Падкрэсліце ў вершы формы аднаго і таго ж слова.

### Творчая хвілінка

Якія кветкі лічацца сімваламі Беларусі? На якім дзяржаўным сімвале нашай краіны можна ўбачыць кветкі лёну? Якая кветка з'яўляецца сімвалам «Славянскага базару ў Віцебску»? Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.


Спампавана з сайте aversev.by

**7.** Прачытайце. Якія галасы ў прыроды?



У любую **пару́** года,
у **пагоду, непагоду,**
слухай родную прыроду —
ты **пачуеш** галасы
таямнічае красы.

*В. Жуковіч.*

Выпішыце выдзеленыя словы ў два слупкі: у адзін — словы з прыстаўкай, у другі — без прыстаўкі. Якія з выпісаных слоў з'яўляюцца аднакаранёвымі?

**8.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння прыстаўкі ў слове *пагаварыць*.

**1. Падбіраем да слова аднакаранёвыя словы без ... або з іншымі ... .**

*Пагаварыць — гаварыць, гаворка; загаварыць, адгаварыць, выгаварыцца.*

**2. Знаходзім у аднакаранёвых словах ... .**

*Пагаварыць, гаварыць, гаворка, загаварыць, адгаварыць, выгаварыцца.*

**3. Частка слова, якая стаіць перад коранем, будзе ... . Абазначаем ... .**

***Па**гаварыць.*



Спампавана з сайте aversev.by

**9.** Прачытайце словы. На якія тры групы іх можна размеркаваць?

Перапісаць, дапісаць, выпісаць, перагле́дзець, даглядзець, перабраць, дабраць, вы́глядзець, перачытаць, выбраць, дачытаць, вычытаць.

Запішыце асобна словы кожнай групы. Абазначце ў іх прыстаўкі.

**10.** Прачытайце. Які настрой перадаецца ў вершы: сур'ёзны ці жартоўны? Як мама выканала просьбу дачушкі?

### Уключыце сонейка

Каця абудзілася.
— Яшчэ ноч? — здзівілася. —
Не хачу быць сонненькай —
**уключыце** сонейка!

Мама шторы
расхіну́ла —
сонца ў хату зазірнула.

*І. Муравейка.*

Знайдзіце і выпішыце словы з прыстаўкамі. Падкрэсліце тыя, якія ўжыты ў пераносным значэнні.

Да выдзеленага слова падбярыце і запішыце аднакаранёвае з супрацьлеглым значэннем. Абазначце корань і прыстаўку.



Спампавана з сайте aversev.by

**11.** Прачытайце. Падбярыце да кожнага слова аднакаранёвае з супрацьлеглым значэннем.

*Унесці — вынесці*, адгадаць — ..., зайсці — ..., падступіць — ..., пад'ехаць — ... .

Запішыце пары слоў. Абазначце прыстаўкі.

Са слоўнікавым словам і антонімам да яго прыдумайце і запішыце сказы.

**вы́йсці**

**12.** Прачытайце. Замяніце выдзеленыя словы на аднакаранёвыя з прыстаўкамі ***раз-***, ***пра-***, ***у-***, ***з-*** так, каб атрымаліся блізкія па значэнні спалучэнні слоў.

*Адгадаць загадку — разгадаць загадку;* **перамяніць** заданне — ...; **высушыць** адзенне — ...; **занесці** ў кватэру — ... .

**13.** Спішыце, дапісваючы ў словы патрэбныя прыстаўкі ***(пра-***, ***пры-***, ***аб-***, ***па-)***. Абазначце іх.

У гушчыні лесу ..крычала арэ́хаўка. І зноў стала ціха. Нават ветрык ..таіўся.

Сонейка падабралася ўжо да палавіны неба.

Каля пня знаходзіўся мурашнік. Уверсе ён быў ..леплены мурашкамі. Гэта іх сонейка сюды ..клікала ..грэцца. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**арэ́хаўка** — лясная пеўчая птушка сямейства вераб'іных



Спампавана з сайте aversev.by

**14.** Прачытайце словы. Правільна вымаўляйце гукі на месцы выдзеленых літар. Назавіце прыстаўкі ў словах. Чым адрозніваецца вымаўленне прыставак у кожнай пары слоў?

**?!** Чаму прыстаўкі так вымаўляюцца?

[т] [д]
а**д**капаць — а**д**ліпнуць

[т] [д]
на**д**пісаць — на**д**будаваць

[т] [д]
па**д**казка — па**д**рэзка

[т] [д]
пра**д**казаць — пра**д**бачыць

[т] [д]
пера**д**святочны — пера**д**апошні

[п] [б]
а**б**смажыць — а**б**варыць

[п] [б]
а**б**трэсці — а**б**ысці

Спішыце пары слоў. Абазначце ў іх прыстаўкі. Ці аднолькава пішуцца прыстаўкі ў кожнай пары слоў?

> Прыстаўкі ***аб-, ад-, над-, пад-, прад-, перад-*** пішуцца нязменна.


Спампавана з сайте aversev.by

**15.** Разгледзьце схему. З апорай на яе раскажыце правіла правапісу прыставак, якія заканчваюцца на ***б***, ***д***. Прыдумайце і намалюйце сваю схему або малюнак, якія дапамагаюць запомніць правапіс гэтых прыставак.

**Пішуцца нязменна**




**16.** Пры дапамозе прыставак ***ад-***, ***пад-***, ***прад-***, ***аб-*** утварыце ўсе магчымыя аднакаранёвыя словы ад прапанаваных. Запішыце іх. Абазначце корань і прыстаўку.

гаварыць — …
несці — …
казаць — …
пілаваць — …
вязаць — …
рэзаць — …

Узор. *Гаварыць — адгаварыць, падгаварыць, абгаварыць.*


Спампавана з сайте aversev.by

**17.** Прачытайце тэкст. Пра якія незвычайныя паводзіны ластавак вы даведаліся?

## Ластаўкі

У садзе на вішні сядзелі маладзенькія ластавачкі. Яны толькі ўчора гняздо **пакінулі. Пайшоў** ціхі дождж, а ластавачкам хоць бы што.



Клапатлівыя бацькі час ад часу **па..лятаюць** да дзяцей, а тыя шырока разяўляюць свае дзюбкі. Толькі не кузуркамі кормяць малых, бо тыя **па..час** дажджу знікаюць, а **прыносяць** кроплі дажджавой вады. Ластаўкі ў **а..розненне** ад іншых птушак п'юць ваду не з зямлі, а на ляту́. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

Выпішыце выдзеленыя словы. Устаўце прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі ў словах.

Знайдзіце аднакаранёвыя словы і выпішыце іх.

**18.** Прачытайце народныя прыкметы і запомніце іх. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

Ранняя навальніца — **пра..казальніца** гарачага лета.

**Адцвіла** рабіна — па **па..бярозавікі збірацца** можна.

Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах.


Спампавана з сайте aversev.by

**19.** Прачытайце словы. Падбярыце да іх аднакаранёвыя словы-антонімы.

прывыкаць — …  
падбегчы — …  
закапа́ць — …  
зачыніць — …

Узор: *прычальваць* — *адчальваць*  
…

Запішыце пары слоў, абазначце прыстаўкі. Са слоўнікавым словам прыдумайце і запішыце сказ.

**адчыні́ць**

**20.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце словы-адгадкі.

1. На **досвітку** з-за небакраю  
яно дзень новы **а..вяшчае**,  
а вечарам ізноў знікае  
на іншым краі небакраю.

н о ц с а

2. Ля́сне так па небе пугай,  
быццам бразнула над вухам.  
Цэлы дзень парой грукоча,  
не спыняецца і **ўночы**.  
Як знайшоў **а..гадку** сам,  
**па..кажы** яе сябрам.

*А. Зэкаў.*

о р г м

Спішыце адну загадку на выбар. Устаўце прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах.



Спампавана з сайте aversev.by

**21.** Спішыце пары слоў. Абазначце прыстаўкі. Якімі літарамі адрозніваюцца прыстаўкі ў кожнай пары?

зрабіць — сказаць
узляцець — ускапаць
разгадаць — расказаць
бездапаможны — беспамылковы
бязрогі — бясхвосты

У кожным слове падкрэсліце першую літару кораня. Які гук яна абазначае?

**?!** Як вы думаеце, ад чаго залежыць правапіс літар ***з***, ***с*** у прыстаўках?

У прыстаўках ***з-/с-, раз-/рас-, без-/бес-, уз-/ус-*** літара ***з*** пішацца перад звонкімі зычнымі, а літара ***с*** — перад глухімі зычнымі.

**22.** Разгледзьце схему. З апорай на яе раскажыце правіла правапісу прыставак, якія заканчваюцца на ***з***, ***с***.




Прыдумайце і намалюйце сваю схему або малюнак, якія дапамагаюць запомніць правапіс гэтых прыставак.


Спампавана з сайте aversev.by

**23.** Дапішыце ў словы патрэбныя прыстаўкі. Падкрэсліце першую літару кораня.

*з-/с-:* ..берагаць, ..варыць, ..палохаць, ..кладаць, ..рэзаць, ..хапіць.

*уз-/ус-:* ..капаць, ..пеніць, ..трывожыць, ..рыхліць, ..калыхнуць.

*без-/бес-:* ..працоўны, ..выніковы, ..клапотны, ..дапаможны.

**24.** Прачытайце верш. Які занятак знайшла сабе дзяўчынка? За што пахвалілі яе бацькі? Чаму верш мае такую назву?

**Беларусачка**

Розных кветачак у полі
**ра..цвіло** нямала.
У прыполік наша Поля
**..ранку** іх **..бірала**.

У вянку **прыбегла** ў хату
прыгажуня русая.
**Пахвалілі** мама з татам:
— Наша беларусачка!

*Р. Бензярук.*



Выпішыце выдзеленыя словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі.

Знайдзіце ў вершы словы, якія адрозніваюцца адным гукам.



Спампавана з сайте aversev.by

**25.** Прачытайце народныя прыкметы і запомніце іх. Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары.

Галкі ў чародкі *(з/с)*лятаюцца і крычаць — да яснага надвор'я.
Рыба ў*(з/с)*плёсквае вячэрняй парой — да добрага надвор'я.

Абазначце прыстаўкі ў словах, падкрэсліце першую літару кораня.

**26.** Прачытайце калыханку. Хто і з якім пачуццём спявае яе дзіцяці?

## Калыханка

Як дзіцятка **засынае** —
тут жа скрыпачка **зайграе.**
**Паглядзі:** вятры з аблокаў
над зямлёю **невысока**
для цябе **..пплялі** арэлі,
што, як птушка, **у..ляцелі!**
**У..ляцелі,** каб вярнуцца,
з табой побач апынуцца.
**Ра..гайдае** іх вятры́ска —
зоркі **ўбачыш** блізка-блізка.

*В. Праўдзіна.*

**вятры́ска** — моцны вецер

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах.



Спампавана з сайте aversev.by

**27.** Вусна складзіце па падказках алгарытм выбару напісання ***з***, ***с*** у прыстаўках.

**1. Вымаўляем слова. Вызначаем у ім … і … .**

*У?ляцець, у?клікнуць.*

**2. Знаходзім першы гук … .**

*У?**л**яцець* — [л’], *у?**к**лікнуць* — [к].

**3. Калі першы зычны гук кораня**

**звонкі, пішам … .** — *у**з**ляцець*

**глухі, пішам … .** — *у**с**клікнуць*

**28.** Дапішыце ў словы патрэбныя прыстаўкі.

***без-/бяз-:*** ..дымны — ..дапаможны, ..дарожны — ..ветраны.

***бес-/бяс-:*** ..платны — ..памылковы, ..колерны — ..пілотны.

Якімі галоснымі адрозніваюцца прыстаўкі ў парах слоў? Растлумачце правапіс ***е***, ***я*** ў прыстаўках.

**Рм** Сярод запісаных слоў знайдзіце сінонімы да слоў *сла́бы, ціхі*.

Выканайце інтэрактыўнае заданне.



Спампавана з сайте aversev.by

**29.** Замяніце разгорнутае тлумачэнне адным словам па ўзоры. Запішыце словы, вызначце ў іх націск, абазначце корань і прыстаўку.

*Той, які не мае клопатаў, —* ***бесклапо́тны.***
Той, які не мае білета, — … .
Той, які не мае меж, — … .
Той, які не мае канца, — … .

**30.** Прачытайце верш. Што ў ім праўдзівае, а што — казачнае?



### Камета

Ціха шэпчуцца планеты:
— Зноў сюды ляціць камета!
Вакол Сонца абарот
робіць раз за сотню год.
Як да Сонца **па..лятае** —
«хвост» свой ярка **ра..пускае,**
каб крыху́ **пакрасавацца**
і… на сто гадоў **..хавацца.**

*Г. Аўласенка.*

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах. Растлумачце іх правапіс.

Назавіце словы, правапіс якіх трэба правяраць. Вусна падбярыце праверачныя словы.

*Творчая хвілінка*

Што вы ведаеце пра каметы? Пры неабходнасці знайдзіце патрэбную інфармацыю ў дзіцячай энцыклапедыі або ў інтэрнэце.


Спампавана з сайте aversev.by

**31.** Прачытайце народныя прыкметы і запомніце іх. Растлумачце правапіс прапушчаных літар.

Кветкі фіялкі **ра..крыліся** і паніклі — да блізкай непагоды.

Галубы **ра..буркаталіся** — усталюецца добрае надвор’е.

Півоня **ра..пусцілася** — можна садзіць агуркі, гарбузы, боб.

Запішыце адну з народных прыкмет па памяці. Абазначце прыстаўку ў выдзеленым слове.

**32.** Да слоў з левага слупка падбярыце сінонімы з правага слупка. Запішыце словы парамі, устаўце прапушчаныя літары, абазначце прыстаўкі.

| | |
|---|---|
| прыбярэжжа | паясніць |
| ра..шчодрыцца | у..гор’е |
| ра..пагоджвацца | падзяляць |
| у..горак | ра..добрыцца |
| ра..мяжоўваць | праясняцца |
| ра..тлумачыць | у..бярэжжа |
| бе..парадак | бестурботны |
| бе..клапотны | непарадак |

Узор: *прыбярэжжа — узбярэжжа*
...

❖ З двума словамі на выбар складзіце і запішыце сказы.



Спампавана з сайте aversev.by

**33.** Спішыце словы, абазначце корань і прыстаўку. Падкрэсліце апошнюю літару прыстаўкі і першую літару кораня.

| | | |
|---|---|---|
| беззямельны | бясстрашны | раззалаціць |
| бяззубы | бессэнсоўны | рассохнуцца |
| аббегаць | аддзяліць | паддобрыць |

Чаму ў словах пішуцца побач дзве аднолькавыя літары?

Калі апошняя літара прыстаўкі і першая літара кораня аднолькавыя, то пішуцца абедзве літары.

**34.** Запішыце спалучэнні слоў, дапісваючы ў словы патрэбныя прыстаўкі.

***аб-/ад-:*** ..бегчы лужыну, ..даляць сустрэчу, ..дзякаваць бабулі, паштовае ..дзяленне.

***раз-/рас-:*** ..садзіць расаду, вельмі ..злавацца, ..зброіць ворага, ..смяшыць сяброў.

***бяз-/бяс-:*** ..снежная зіма, ..следнае знікненне, ..зорнае неба, ..збройны чалавек.

***без-/бес-:*** ..законны ўчынак, ..сістэмная вучоба, ..сардэчны чалавек, **..смяротны подзвіг.**

З выдзеленым спалучэннем слоў вусна складзіце сказ.



Спампавана з сайте aversev.by

**Гаварыце правільна!**

Дзякаваць героям, аддзякаваць матулі, падзякаваць сябру.

**35.** Прачытайце. Да чаго заклікае паэт у вершы? Назавіце пабуджальны сказ.

Адгулі, адгрымелі гарматы.
Хмары чорныя адплылі́.
Прынясіце кветкі салдатам,
што палеглі на нашай зямлі.

*Л. Дайнека.*




Спішыце, абазначце прыстаўкі ў словах.

**Рм** Якая прыстаўка сустракаецца ў словах часцей за ўсё? Для чаго аўтар выкарыстоўвае словы з гэтай прыстаўкай?

*Творчая хвілінка*

Запытайцеся ў бацькоў пра сваіх продкаў, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. Па магчымасці прынясіце ў клас фотаздымкі гэтых людзей і раскажыце, як яны набліжалі Дзень Перамогі.

**36.** Прачытайце тэкст. З чым параўноўвае аўтар кветкі на палянцы?

Здаецца, яшчэ ніколі не бачыў на Светлай палянцы столькі кветак. Тут і бальзамін з яркажоўтымі кветкамі сабе месца **а..любаваў.**



Спампавана з сайте aversev.by



Валяр’ян лекавы ружаватымі кветкамі цвіце.

Гарлюха ястрабковая жоўтымі кветкамі ў кошыках сонцу ўсміхаецца. Нават начная фіялка цэлымі астраўкамі раскашу́е.

Падумалася, што гэта над Светлай палянкай вясёлка **ра..сыпалася**, а яе асколкі па траве **ра..ляцеліся**. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**раскашу́е** — расце вельмі свабодна, займае шмат месца

Выпішыце выдзеленыя словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі.

**37.** Прачытайце сказы. Выпішыце спачатку прыказкі, а потым — народныя прыкметы. Растлумачце правапіс прапушчаных літар у словах.

Цецерукі на вершалінах дрэў ра..селіся — да яснага надвор’я.

Пакарміце птушак зімой — яны а..дзячаць вам вясной.

Лепш крыху ..рабіць, чым багата нагаварыць.

Калі салавей усю ноч ..пявае — чакай сонечнага дня.



Спампавана з сайте aversev.by

**Успомніце**

Калі пішацца апостраф?

**38.** Утварыце словы па схеме пры дапамозе прыставак. Па якой прымеце іх можна падзяліць на дзве групы? Запішыце словы ў два слупкі.




Абазначце прыстаўкі ў словах. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

Апостраф пішацца пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны, перад літарамі ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***, калі паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [й’].

**39.** Прачытайце. Выпішыце словы, у якіх трэба пісаць апостраф.

З(*?*)ехаць, уз(*?*)дыхаць, ад(*?*)есці, без(*?*)валосы, без(*?*)языкі, пад(*?*)ляцець, раз(*?*)ехацца, пад(*?*)ём, уз(*?*)яднаць.

Абазначце прыстаўкі ў словах. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.



Спампавана з сайте aversev.by

**40.** Прачытайце верш. Чаму хлопчык напісаў аб'яву? Што ён у ёй зазначыў?

Двор.
        На парка́не — **аб(?)явы сур(?)ёзныя,**
самыя важныя,
                самыя розныя.
Ва ўсіх людзей —
                    неадкладныя справы.
Хто пройдзе міма такой **аб(?)явы**?

«**З(?)губіўся** кот — колеру рыжага, з чорным хвастом. Завецца Чыжыкам. Хто **з(?)нойдзе** яго — калі ласка, вярніце! Вельмі вас просіць Ляўковічаў Віця. Адрас: Зялёная, семдзесят пяць, кватэра шаснаццаць. Буду чакаць!»

*Э. Агняцвет.*

**парка́н** — драўляная агароджа, плот

Выпішыце выдзеленыя словы, растлумачце іх правапіс.

**Рм** Для чаго яшчэ людзі пішуць аб'явы? Уявіце, што вы знайшлі сабаку, які згубіўся. Напішыце аб'яву для яго гаспадароў. Карыстайцеся падказкай.

Аб'ява

У парку знойдзены ... . Ён ... колеру, з ... лапамі і ... хвастом.

Гаспадароў просім ... па нумары ... або звярнуцца на адрас: ... .


Спампавана з сайте aversev.by

**41.** Да слоў з левага слупка падбярыце антонімы з правага слупка. Запішыце словы парамі. Пры неабходнасці ўстаўце на месцы пропускаў апостраф.

аб(?)яднацца
з(?)явіцца
ад(?)язджаць
з(?)ехацца

з(?)нікнуць
пад(?)язджаць
раз(?)яднацца
раз(?)ехацца

Абазначце прыстаўкі ў словах. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

З адной парай антонімаў складзіце і запішыце сказы.

Выканайце інтэрактыўнае заданне.

**42.** Прачытайце сказы. Выпішыце спачатку народныя прыкметы, а потым — прыказкі. Устаўце, дзе трэба, апостраф.

У запас не **пад(?)ясі** і не **вы(?)спішся.**

Да ночы з(?)яўляецца буйна́я раса ці туман — быць добраму надвор(?)ю.

Як **з(?)варыш,** так і **з(?)ясі.**

**З(?)яўленне** вялікай колькасці павукоў прадказвае праясненне надвор(?)я.

Адным канём усё поле не **аб(?)едзеш.**

У выдзеленых словах абазначце прыстаўкі, падкрэсліце першую літару кораня.



Спампавана з сайте aversev.by

**43.** Прачытайце. Як называюцца выдзеленыя ў сказах словы? Як называюцца выдзеленыя часткі ў словах?

Паліна ціхенька **ад**ышла **ад** гняздзечка.
Сяргейка першым **да**бег **да** фінішу.
Машына **на**ехала **на** камень.
Хлопчык **з**’ехаў **з** горкі.

Чым падобныя прыстаўка і прыназоўнік у кожным сказе? Чым адрозніваецца іх правапіс?

**Прыстаўка** — частка слова. **Прыназоўнік** — асобнае слова. Каб адрозніць прыназоўнік ад сугучнай прыстаўкі, трэба паставіць паміж прыназоўнікам і наступным словам яшчэ адно слова: *(за)йсці (за)дом* — *зайсці за **суседні** дом*.

**44.** Утварыце спалучэнні слоў па схемах і запішыце іх.




Абазначце прыстаўкі ў словах, падкрэсліце прыназоўнікі.


Спампавана з сайте aversev.by

Што змянілася ў выдзеленых словах пры ўтварэнні спалучэнняў слоў? Абазначце ў іх канчаткі.

**45.** Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі, каб атрымаліся правільныя выказванні.

Прыстаўка служыць
Прыназоўнік служыць

для

сувязі слоў у сказе.
ўтварэння новых слоў.

Якая частка слова выконвае тую ж ролю ў сказе, што і прыназоўнік?

**46.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

*(З)*малых крыніц вялікая рака нараджаецца.
*(За)*двума зайцамі пагонішся — ніводнага не *(з)*ловіш.
*(За)*сцяро́га ніколі не шкодзіць.
Як гукаюць, так і *(ад)*клікаюцца.
Не *(ад)*кра́сных слоў дабро на свеце стала.
З разумным *(на)*добрае *(на)*вучышся, а з неразумным — развучышся.

**засцяро́га** — вельмі асцярожныя адносіны да чагосьці (*рус*. предосторожность)
**кра́сныя сло́вы** — прыгожыя словы

Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.


Спампавана з сайте aversev.by

**47.** Замяніце спалучэнні слоў супрацьлеглымі па сэнсе.

Падляцець да дрэва — ..., занесці ў хату — ..., выйсці са школы — ..., забегчы ў кватэру — ..., закаціць у двор — ... .

Узор. *Адысці ад дом*[*а*] — *падысці пад дом*[ ].

Запішыце ўтвораныя спалучэнні слоў. Падкрэсліце ў іх прыназоўнікі. Абазначце канчаткі ў формах аднаго і таго ж слова.

Выканайце інтэрактыўнае заданне.

**48.** Прачытайце і запішыце скорагаворкі Уладзіміра Мацвеенкі, карыстаючыся падказкамі.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| З | ш | л | а | п | л | б | і | а | л | а | з | у |
| а | п | з | л | і | р | у | з | м | в | з | і | б. |
| с | а | ў | а | ў | з | о | л | а | о | н | к | е |





Спампавана з сайте aversev.by

| | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | л | а | м | м | ы | л | а | з | м | ы | ы | г | м |
| і | ы | м | л | у | к | а, | л | л | і | л | м | ы | а |
| л | а | з | я | л | ь | М | і | а | ў | с | ё | л | а. |



Абазначце прыстаўкі ў словах, падкрэсліце прыназоўнікі.

## Суфікс

**49.** Разгледзьце малюнкі. Дапоўніце подпісы пад імі аднакаранёвымі словамі, якія падыходзяць па сэнсе.



грузавая …



… масла



… цеплавоза



маленькая …



Спампавана з сайте aversev.by

Запішыце аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх корань і канчатак.

Ад якога слова і пры дапамозе чаго ўтварыліся словы *машынка*, *машыніст*, *машыннае*? Абазначце гэтыя часткі слоў знакам ^. Дзе яны знаходзяцца ў слове: перад коранем ці пасля яго?

Узор: *машынка*.

> Частка слова, якая стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння слоў, — гэта **суфікс.**

**50.** Прачытайце. Знайдзіце сярод прапанаваных слоў аднакаранёвыя. Запішыце іх па групах, абазначце корань, канчатак і суфікс.

Рыба, грыб, рыбка, пчала, рыбны, грыбок, лясны, грыбны, пчолка, пчаліны, лес, лясок.

**51.** Утварыце словы па ўзоры пры дапамозе суфіксаў.

*малы* — *мал**еньк**і*
белы — …
*добры* — *добр**аньк**і*
шэры — …
*дарагі* — *дараж**эньк**і*
стары — …

*мыш* — *мыш**к**а*
ліпа — …
*рот* — *роц**ік***
нос — …
*ключ* — *ключ**ык***
боршч — …

Якое значэнне (памяншальна-ласкальнае ці павелічальнае) надаюць гэтыя суфіксы словам?



Спампавана з сайце aversev.by

Кожны суфікс мае сваё значэнне. Суфіксы ***-еньк-***, ***-аньк-***, ***-эньк-***, ***-к-***, ***-ік-***, ***-ык-***, ***-ок-*** надаюць значэнню слова памяншальна-ласкальнае адценне.

**52.** Прачытайце тэкст. Чаму замаркоціўся Міхаська? Як суцешыў яго дзед? Якая прыказка сустрэлася ў тэксце?

Раніцай неба цёмныя хмары аблажылі. Дожджык зацерусі́ў. Сядзіць Міхаська ля акна, глядзіць, як па двары празрыстымі ножкамі дождж танцуе, і ледзь не плача.

Дзед убачыў, што ўнук замарко́ціўся, падышоў да яго і кажа:

— Не хвалюйся, унучак. Цёплы дожджык вясной ніколі не шкодзіць. Траўка хутчэй расці пачне. Ведаеш, як гавораць пра такую пару года? Два дажджы ў маі — і не дбай аб ураджаі. А грыбы нікуды ад нас не падзенуцца, толькі яшчэ больш падрастуць. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**замарко́ціўся** — засумаваў, засмуткаваў
**дбаць** — клапаціцца

Знайдзіце ў тэксце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Назавіце ў іх суфіксы. Чаму аўтар часта выкарыстоўвае такія словы?

Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы.



Спампавана з сайте aversev.by

**53.** Прачытайце. Які настрой перадаецца ў вершы: сур'ёзны ці жартоўны? Якія словы дапамагаюць перадаць ласкавыя адносіны да коціка?

Брудным быць не хоча **коцік:**
мые **спінку** і **жывоцік,**
мые **лапкі, хвосцік** мые...
Вучаць коціка малыя:
— Станеш чыстым, коце мілы,
толькі трэба мыцца з мылам.

*В. Гардзей.*

Спішыце. Абазначце канчатак, корань і суфікс у выдзеленых словах.

**54.** Прачытайце і адгадайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.



Як **маленькі** —
**рожкі** мае,
**хмаркі** ён
на іх гайдае.



Падрасце —
бы шар **агністы,**
свеціць нам
у небе чыстым.

*А. Прохарaў.*

е м ц я с

Спішыце. Абазначце суфіксы ў выдзеленых словах.


Спампавана з сайте aversev.by

**55.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

У **козачкі** — казляня,
у **але́ніхі** — аленяня́,
у **курачкі** — кураня,
у **гусачкі** — гусяня.
У маёй **мамачкі** — гэта я!

*У. Мацвеенка.*

Спішыце. Сярод выдзеленых слоў знайдзіце тыя, якія маюць памяншальна-ласкальнае значэнне. Абазначце ў іх суфікс. Якія адносіны да матуль перадаюцца ў скорагаворцы пры дапамозе гэтых слоў?

У словах — назвах дзіцянят жывёл абазначце суфікс.

Пры дапамозе суфіксаў ***-ан-, -ян-*** утвараюцца словы — назвы дзіцянят жывёл: *кацяня*, *ваўчаня*.

**56.** Утварыце аднакаранёвыя словы па ўзоры.

*зубр* — *зубр**ыц**а* — *зубр**ан**я*
воўк — … — …
мядзведзь — … — …

*барсук* — *барсуч**ых**а* — *барсуч**ан**я*
лось — … — …
морж — … — …

Запішыце. Абазначце суфіксы ў словах.



Спампавана з сайте aversev.by

**57.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння суфікса ў слове *гусачка.*

**1. Змяняем ... .**

***Гусачка**, гусачкі, гусачку, гусачкай.*

**2. Знаходзім у слове ... .**

*Гусачк[**а**].*

**3. Падбіраем да слова ... словы.**

***Гусачка** — гусь, гусак, гусіны, гусяня.*

**4. Знаходзім у аднакаранёвых словах ... .**

*Гусачка, гусь, гусак, гусіны, гусяня.*

**5. Частка слова, якая стаіць пасля кораня і перад канчаткам, будзе ... . Абазначаем ... .**

*Гусачка.*

**58.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць? Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Для чаго аўтар выкарыстоўвае іх?

На ўзгорку пад сасной знаходзіцца барсукова нара. Каля нары тры барсучкі дурэюць. Маладзенькія яшчэ зусім. Барсучыха на паляванне адлучылася, а ім гэта на руку́. Асмялелі, вылезлі з нары на сонейка і качаюцца па зямлі. А потым



Спампавана з сайте aversev.by



падхопяцца на свае кароткія лапкі і давай даганяць адзін аднаго. Але далей кусціка ажын, што зусім блізка каля нары расце, не адыходзяць. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**ім гэта на руку́** — іх гэта задавальняе

Выпішыце аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх канчатак, корань, суфікс. Як па-іншаму можна назваць барсучкоў?

Выпішыце з тэксту словы з памяншальна-ласкальным значэннем, абазначце ў іх суфіксы.

**Гаварыце правільна!**

на руку́, на скорую руку́, у руку́, пад руку́



Спампавана з сайте aversev.by

**59.** Утварыце аднакаранёвыя словы пры дапамозе суфіксаў. Што абазначаюць гэтыя словы?

***-іст-***

*баян — баян**іст***
піяніна — ...
праграма — ...

***-ыст-***

*трактар — трактар**ыст***
бульдозер — ...
веласіпед — ...

***-ар-***

*млын — млын**ар***
аптэка — ...
бібліятэка — ...

***-чык-***

*лятаць — лёт**чык***
ракета — ...
грузіць — ...

**млын** — вятра́к (*рус.* мельница)

Пры дапамозе суфіксаў ***-іст-, -ыст-, -ар-, -ор-, -чык-, -шчык-*** утвараюцца словы — назвы людзей паводле іх заняткаў, прафесій: *журналі**ст**, шахмат**ыст**, кух**ар**, барабан**шчык**, пераплёт**чык**, танц**ор**.*

**60.** Дапоўніце сказы патрэбнымі аднакаранёвымі словамі. Запішыце. Абазначце корань і суфікс у гэтых словах.

Установа для перасылкі пісем, грошай, лёгкіх грузаў — гэта ... .

Скрынка для пошты — ... скрынка.



Спампавана з сайте aversev.by

Паштовы служачы, які разносіць пошту, — гэта … .

Словы для даведкі: *паштовая, паштальён, пошта.*

Знайдзіце ў сказах формы аднаго і таго ж слова. Абазначце ў іх канчаткі.

Назва якой прафесіі сустрэлася ў сказах? Растлумачце правапіс **ь** у суфіксе.

**по́шта**

**61.** Знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Што аб'ядноўвае астатнія словы ў кожнай групе? Запішыце гэтыя словы, абазначце суфіксы.

1. Кацяня, кот, сланяня, лісяня, бусляня.
2. Чорненькі, жоўценькі, каляровы, сіненькі, ружовенькі.
3. Качаня, шпачаня, бобр, бабраня, выдраня.
4. Цымбаліст, баскетбаліст, журналіст, работа, танкіст.

**62.** Утварыце аднакаранёвыя словы па ўзоры. Запішыце. Абазначце ў іх корань і суфікс.

| | |
|---|---|
| *лімон* — *лімонны* | *сасна* — *сасоннік* |
| камень — … | ажына — … |
| туман — … | маліна — … |
| карціна — … | ляшчына — … |



Спампавана з сайте aversev.by

**63.** Разгледзьце ланцужкі слоў. Прасачыце, як утварыліся словы. Чаму ў словах пішуцца побач дзве аднолькавыя літары?

гадзіна — гадзінны — гадзіннік

конь — конны — коннік

дзень — дзённы — дзённік

**дзённік**

Запішыце ланцужок слоў, у якім ёсць слоўнікавае слова.

Калі корань заканчваецца на *н*, а суфікс пачынаецца з гэтай літары, то пішуцца абедзве літары.

**64.** Прачытайце тэкст. Якія бываюць гадзіннікі?

Усе мы карыстаемся гадзі(*н*/*нн*)ікамі. Яны бываюць **наруч(*н*/*нн*)ыя, настоль(*н*/*нн*)ыя, кішэ(*н*/*нн*)ыя**. Ёсць з боем праз кожную гадзіну, з будзільнікам, які пабудзіць у патрэбны час. Ды і не пералічыш усіх гадзі(*н*/*нн*)ікаў, што прыдуманы чалавекам. *(Паводле А. Жука.)*

Спішыце першы і другі сказы, устаўляючы патрэбныя літары. Абазначце корань і суфікс у выдзеленых словах.



Спампавана з сайте aversev.by

**65.** Прачытайце словы. На якія дзве групы іх можна падзяліць?

Хат*(н/нн)*і, лет*(н/нн)*і, вясе*(н/нн)*і, падма*(н/нн)*ы, ляс*(н/нн)*ы, галод*(н/нн)*ы, бясco*(н/нн)*ы, ра*(н/нн)*і.

Выпішыце словы, у якіх трэба пісаць літары ***-нн-***. Абазначце корань і суфікс.

**66.** Прачытайце прыказку. Калі так гавораць?

Ра**нн**яя птушка крыльцы **цяр**э́**біць**, а позняя вочкі трэ.

**цярэ́біць** — чысціць дзюбай пер'е

Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запішыце прыказку па памяці.

**67.** Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары.

1. Самыя **ра*(н/нн)*ія** белыя грыбы сустракаюцца ў дубровах. 2. У **сасо*(н/нн)*іку** можна назбіраць маслякоў і груздоў. 3. У лесе растуць **падма*(н/нн)*ыя** лісічкі аранжавага ці чырвонага колеру. 4. **Тума*(н/нн)*ай** раніцай трэба збірацца ў грыбы. 5. Ноч перад паходам у грыбы для Аленкі была **бя*(с/сс)*о*(н/нн)*ай.**

Разбярыце па саставе выдзеленыя словы.



Спампавана з сайте aversev.by

**68.** Вусна складзіце па падказках алгарытм разбору слова *перапіска* па саставе.

**1. Змяняем ..., знаходзім ... частку, выдзяляем ... .**

*Перапіск*[***а***] — *перапіск*[***і***], *перапіск*[***ай***], *перапіск*[***у***].

**2. Падбіраем да слова аднакаранёвыя ..., знаходзім у іх ..., выдзяляем у слове ... .**

*Перапіск*[*а*] — ***пісаць***, *пад**піс**аць*, *за**піс***, *под**піс***, *пера**піс***.

**3. Калі перад коранем ёсць частка слова, то гэта ... .**

***Пера**пісk*[*а*].

**4. Калі пасля кораня і перад канчаткам ёсць частка слова, то гэта ... .**

*Перапіс**к***[*а*].

**69.** Запішыце словы ў тры слупкі так, каб іх будова адпавядала прапанаваным схемам.



Узгорак, горны, гара; мора, заморскі, мара́к; смешны, смех, насмешка; стол, настольны, столік.


Спампавана з сайте aversev.by

**70.** Прачытайце словы. Назавіце ў іх прыстаўкі. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Распусцяцца, прыбралася, выступаюць, пачулі, спускаюцца, паласавацца, зламалася.

Дапоўніце гэтымі словамі сказы ў тэксце.

Лес сустрэў нас дзіўнай прыгажосцю. Распусціліся каташкі́ арэшніку, выкінулі воблачкі жоўтага пылку. Хутка ... набухлыя пупышкі ў асіны і бярозы. ... у карычневыя завушніцы вольха.



... цяпло мурашкі. Самы вялікі мурашнік на Лысай гары ля маладога клёна. Па дрэве ўверх **роўненькім ланцужком** паўзуць мурашкі. Другія мурашкі такім жа роўненькім ланцужком ... з дрэва. Там, дзе ... галінка клёна, ... **кропелькі** соку. Вось і спяшаюцца туды мурашкі, каб ... ім. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

Спішыце сказы, якія адпавядаюць малюнку. Назавіце суфіксы ў выдзеленых словах. Якое значэнне яны надаюць словам?

Да слова *мурашы́ны* знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. Выпішыце іх, разбярыце па саставе.



Спампавана з сайте aversev.by

**71.** Размяркуйце словы на дзве групы і запішыце ў два слупкі. Назавіце прыметы, па якіх словы былі аб’яднаны ў групы.

Адбегчы, **адважны**, адвар, адводзіць, адкруціць, адзін, адмірал, адсталы.

Разбярыце па саставе выдзеленае слова.

**72.** Разгадайце і назавіце слова, у якім:

1) тая ж прыстаўка, што і ў слове *прыкруціць*;
2) той жа корань, што і ў слове *гарадок*;
3) той жа суфікс, што і ў слове *карэнны*;
4) той жа канчатак, што і ў слове *добры*.

***Творчая хвілінка***

Прыдумайце загадку, падобную загадцы з практыкавання 72. Загадайце яе аднакласнікам.

**73.** Дапоўніце сказы патрэбнымі аднакаранёвымі словамі. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.

Мужчынскі і жаночы галаўны ўбор розных фасонаў — гэта ... .
Невялікі кап..люш — гэта ... .
Магазін, у якім прадаюць кап..люшы́, — гэта ... магазін.

Словы для даведкі: *кап..люшык, кап..люш, кап..люшны.*


Спампавана з сайте aversev.by

Разбярыце па саставе аднакаранёвыя словы.
❖ У формах аднаго і таго ж слова абазначце канчаткі.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Адкажыце на пытанні*

1. Якія словы называюцца аднакаранёвымі?
2. Як вызначыць корань у слове?
3. Што такое канчатак? Што ён утварае?
4. Што такое прыстаўка?
5. Як вызначыць прыстаўку ў слове?
6. Якія прыстаўкі пішуцца нязменна?
7. Ад чаго залежыць правапіс прыставак, якія заканчваюцца на ***з, с***?
8. Чаму ў слове *рассмяшыў* пішуцца побач дзве аднолькавыя літары?
9. Як адрозніць прыназоўнік ад сугучнай прыстаўкі?
10. Што такое суфікс?
11. Як вызначыць суфікс у слове?

### *Творчая хвілінка*

Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Склад слова». Падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на адну з тэм: «Аднакаранёвыя словы і формы слова», «Часткі слова». Карыстайцеся інфармацыяй на форзацах вучэбнага дапаможніка.


Спампавана з сайте aversev.by

# ЧАСЦІНЫ МОВЫ

**74.** Прачытайце словы. Паспрабуйце растлумачыць іх значэнне з апорай на малюнкі.

Сонейка, хмара, яркае, схавалася, за, выглянула, з-за, вялікая.



схавалася **за** хмару — выглянула **з-за** хмары

Размяркуйце словы ў тры слупкі:

| | |
|---|---|
| словы — назвы прадметаў | словы — назвы прымет прадметаў |
| ... | ... |

словы — назвы дзеянняў прадметаў

...



Спампавана з сайте aversev.by

На якія пытанні адказваюць словы кожнай групы?

Якія словы з практыкавання не называюць прадметаў, прымет і дзеянняў? Як яны называюцца?

**75.** Са слоў кожнай групы паспрабуйце скласці сказы. Якія словы нельга аб'яднаць у сказ? Якім словам трэба дапоўніць словы другой групы, каб атрымаўся сказ?

1. Дзяўчынкі, прыгожую, спяваюць, песню.
2. Хлопчыкі, валейбол, гуляюць.
3. На, пад, перад, за, між.

Запішыце сказы і разбярыце іх па членах сказа. Якімі членамі сказа з'яўляюцца словы — назвы прадметаў, прымет, дзеянняў?

Словы ў мове падзяляюцца на вялікія групы — **часціны мовы.** Кожная часціна мовы мае сваё значэнне, адказвае на свае пытанні, мае свае прыметы, выконвае сваю ролю ў сказе. Назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, прыназоўнік — гэта часціны мовы.

**76.** Разгледзьце схему «Часціны мовы» на форзацы 1. Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Словы, якія абазначаюць прадметы, — гэта ... .

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, — гэта ... .

Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, — гэта ... .



Спампавана з сайте aversev.by

**77.** Прачытайце. Што аб'ядноўвае словы ў кожнай групе?

1. Сіні, сінь, сінець.
2. Падабрэць, добры, дабрыня.
3. Белізна, белы, пабяліць.
4. Выхад, хадзіць, хадавы.

Падзяліце словы на тры групы па іншай прымеце, якая адпавядае тэме ўрока. Запішыце іх у тры слупкі. Назавіце прымету, якая аб'ядноўвае словы ў кожным слупку.

**78.** Прачытайце. З кім параўноўвае паэт вясну ў вершы? Пра якія «фотаздымкі лесу» ён гаворыць?



**Вясна**

Блакіт нябёсаў
і блакіт пралесак.
Рудое сонца
між бяроз брыдзе.
Вясна зрабіла
фотаздымкі лесу
і картачкі пакінула вадзе.

*М. Башлакоў.*

Спішыце. Па пытаннях вызначце сувязь слоў у другім сказе. Якімі членамі сказа з'яўляюцца словы — назвы прадметаў, прымет, дзеянняў?

**Рм** Уявіце сябе фотакарэспандэнтамі. Што б вы сфатаграфавалі на вуліцы вясной?



Спампавана з сайте aversev.by

**79.** Прачытайце тэкст. Калі фотаздымкі становяцца творамі мастацтва?



**Фатаграфія — малюнак** святлом. Промні святла праходзяць праз аб'ектыў і **ўтвараюць** карцінку. На першы погляд, фатаграфія — звычайнае адлюстраванне чалавека і навакольнага свету. Аднак калі **фатографу** ўдаецца ўра́зіць, усхваляваць гледача, тады яго **фотаздымкі становяцца творамі** мастацтва. *(Па матэрыялах часопіса «Вясёлка».)*

Спішыце сказы з выдзеленымі словамі. Знайдзіце і падкрэсліце сказ, у якім усе словы называюць прадметы.

❖ Якія з выдзеленых слоў называюць прадметы, а якія — дзеянні прадметаў?

## Назоўнік

**80.** Вусна дапоўніце сказы тэксту патрэбнымі словамі. Што абазначаюць гэтыя словы? На якія пытанні адказваюць?

Прыгравае веснавое ... . ... сядзіць у гамаку і чытае казкі. Раптам на яе сукенку садзіцца прыгожы ... . ... уяўляе яго казачным эльфам.



Спампавана з сайте aversev.by

... матылька злёгку дрыжаць. Здаецца, быццам гэты ... кліча Насцю ў незвычайнае падарожжа.

Словы для даведкі: *сонейка, Насця, матылёк, дзяўчынка, крыльцы, прыгажун.*

Словы, якія абазначаюць прадметы і адказваюць на пытанні х т о? або ш т о?, — гэта **назоўнікі.**

**Успомніце**

Якія назоўнікі адказваюць на пытанне х т о?, а якія — на пытанне ш т о?

**81.** Прачытайце верш. Што можа нагадаць хмара чалавеку з багатай фантазіяй? Чаму верш мае такую назву?



## Ператварэнні

Да каго падобна **хмара**?
Да **слана** і **ягуара**.
Да **мядзведзя** і **янота**,
да слана і **бегемота**.
Да **сабакі**, **кракадзіла**,
да вялікай да **гарылы**.
А яшчэ яна — як **дом**,
дзе жыве дзядуля Гром.

*З. Марозаў.*



Спампавана з сайте aversev.by

Размяркуйце выдзеленыя словы на дзве групы. Выпішыце спачатку назоўнікі, якія адказваюць на пытанне х т о?, а пасля — назоўнікі, якія адказваюць на пытанне ш т о?

Узор. Х т о? *Слон*, …
Ш т о? *Ператварэнне*, …

**Рм** Пра што вы любіце пафантазіраваць у вольны час?

***Творчая хвілінка***

Людзі якіх прафесій выкарыстоўваюць фантазію?

**Гаварыце правільна!**

Падобны **на** тату, падобны **да** тат**ы**.
Падобная **на** маму, падобная **да** мам**ы**.

**82.** З асобных слоў складзіце сказы. Запішыце адзін сказ на выбар. Па пытаннях вызначце сувязь слоў у гэтым сказе.

Пісьменнікі, незвычайныя, прыдумваюць, сюжэ́ты, для, кніг.
Кампазітары, цудоўныя, ствараюць, мелодыі.

**сюжэ́т** — асноўныя падзеі мастацкага твора

Якімі членамі сказа з'яўляюцца назоўнікі?



Спампавана з сайте aversev.by

Назоўнік у сказе часцей бывае дзейнікам або даданым членам сказа:

*Дзеці малююць* (к а г о?) *фантастычных жывёл.*

**83.** Прачытайце верш. Які народны інструмент лічыцца сімвалам беларускай музычнай культуры?



## Цымбалы

Без цымбалаў немагчыма
ўявіць зямлю — Айчыну,
бо і ў радасці, і ў скрýсе
любяць іх на Беларусі:
пад цымбалы,
пад цымбалы
тут Лявоніха скакала!
А цяпер пад тыя ж гукі
скачуць праўнукі і ўнукі.

*А. Пісьмянкоў.*

**у скрýсе, скрýха** — смутак, журба

Як паэт называе Беларусь у вершы? Падбярыце і запішыце сінонімы да слова *Айчына*. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца?

Якія супрацьлеглыя па сэнсе назоўнікі выкарыстоўвае аўтар? Для чаго?

Выпішыце аднакаранёвыя назоўнікі. Разбярыце іх па саставе.



Спампавана з сайте aversev.by

**84.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Далёкая старонка без ветру сушыць.

Вусна вызначце сувязь слоў у сказе.

Назавіце ў сказе прыназоўнік. Да якога назоўніка ён адносіцца? Якім членам сказа з'яўляецца гэты назоўнік?

**85.** Утварыце аднакаранёвыя назоўнікі па ўзоры.

*рака — рэчка*
воблака — …
хмара — …

*праўда — няпраўда*
удача — …
воля — …

*мяжа — узмежак*
гара — …
лес — …

*званіць — звон*
хадзіць — …
лазіць — …

Са слоўнікавым словам і аднакаранёвым да яго складзіце і запішыце сказы.

**86.** Спішыце і запомніце народныя прыкметы. Якія слоўнікавыя словы сустрэліся ў іх?

Фіялетавыя воблакі — да дажджу і цяпла.

Пры захадзе сонца перыстыя воблакі — да перамены надвор'я.

Калі воблакі ў небе выцягваюцца, то надвор'е будзе ветранае.

Падкрэсліце ў сказах назоўнікі.

❖ Знайдзіце формы аднаго і таго ж назоўніка. Абазначце ў іх канчаткі.


Спампавана з сайте aversev.by

## Адзіночны і множны лік назоўнікаў

**87.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце прадметы, якія фокуснік паклаў у капялюш. Назавіце прадметы, якія ён дастаў з капелюша.




Запішыце словы парамі. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца?

Узор: *фокус*□ — *фокус*ы
...

Назоўнікі ў парах з'яўляюцца аднакаранёвымі словамі ці формамі аднаго слова? Чаму? Абазначце канчаткі назоўнікаў.

Якія формы слоў абазначаюць адзін прадмет, а якія — многа прадметаў?


Спампавана з сайте aversev.by

Назоўнікі змяняюцца **па ліках.** Назоўнікі ў форме **адзіночнага ліку** абазначаюць адзін прадмет: *капялюш, конь.* Назоўнікі ў форме **множнага ліку** абазначаюць два і больш прадметы: *капелюшы, коні.*

**88.** Утварыце форму множнага ліку назоўнікаў па ўзоры. Запішыце.

*горад — гарад[ы]*
вечар — …
ліхтар — …

*бераг — бераг[і]*
поле — …
кветка — …

*кацяня — кацянят[ы]*
зайчаня — …
шчаня — …

Якія канчаткі маюць назоўнікі ў форме множнага ліку?

Большасць назоўнікаў у форме множнага ліку мае канчаткі ***-і, -ы.***

**89.** Утварыце формы слоў па ўзоры. Запішыце.

*Селянін — сялян[е]*, гараджанін — …, мінчанін — … .

Якія канчаткі маюць гэтыя назоўнікі ў форме множнага ліку?



Спампавана з сайте aversev.by

**90.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з практыкавання 89. Запішыце. Знайдзіце назоўнікі. Пазначце над словамі, у форме якога ліку яны ўжыты.

У сяле жывуць …, а ў горадзе — … .
… сардэчна сустракаюць гасцей сталіцы.

**91.** Прачытайце тэкст. Вусна падбярыце да яго загаловак.



У суботу настаўніца і вучні хадзілі ў цырк. Хлопчыкам і дзяўчынкам *(з, с)*падабалася выступленне гімнастаў і жанглёраў. Ра*(з, с)*весялілі дзяцей дрэсіравáныя малпы, якія гулялі ў мяч. Цыркавое прадстаўленне пакінула прыемныя ўспаміны.



Спішыце другі і трэці сказы, устаўляючы патрэбныя літары.

Знайдзіце ў запісаных сказах назоўнікі. Пазначце над словамі, у форме якога ліку яны ўжыты.

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы. Разбярыце іх па саставе.

**Рм** Ці любіце вы цырк? Чаму? Раскажыце пра самае захапляльнае цыркавое прадстаўленне, якое вы наведалі.


Спампавана з сайте aversev.by

**92.** Спішыце, дапаўняючы сказы назоўнікамі ў дужках. Абазначце канчаткі і лік гэтых назоўнікаў.

У Соні ёсць маленькія *(папугайчык)*. У іх прыгожыя *(мянушка)* — Чык і Рыкі. Раніцай крылатыя *(сябар)* будзяць дзяўчынку гучным чырыканнем. Так *(птушка)* вітаюць сваю гаспадыню. Соня сыпле папугайчыкам *(зярнятка)*, налівае ваду ў паілку. *(Папугайчык)* удзячныя дзяўчынцы.

**93.** Разгледзьце малюнкі. Колькі прадметаў могуць абазначаць запісаныя словы?



штаны



санкі



капуста



малако

Запішыце назоўнікі. Абазначце ў іх канчаткі. Па канчатках вызначце форму ліку назоўнікаў.



Спампавана з сайте aversev.by

Некаторыя назоўнікі ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку *(пячэнне, кефір)* або толькі ў форме множнага ліку *(дзверы, санкі)*.

**94.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

У Варвары — акуляры.
Акуляры ***да твару*** Варвары.
*М. Пазнякоў.*

Спішыце. Падкрэсліце ў сказе назоўнік, які выкарыстоўваецца толькі ў форме множнага ліку.

**Рм** Што абазначае выдзелены выраз у скорагаворцы? Вусна складзіце з ім сказ.

**95.** Прачытайце і адгадайце загадку.

**Што за час такі?**

Могуць дзеці маляваць,
могуць кніжку пачытаць,
могуць мульцікі глядзець,
за камп'ютарам сядзець.
Што за час такі ўсе маюць,
кожны дзень тады гуляюць?
*В. Жукоўская.*

Запішыце загадку разам з адгадкай. Знайдзіце назоўнікі, вызначце лік. Які назоўнік ужываецца толькі ў форме множнага ліку?


Спампавана з сайте aversev.by

**96.** Разгледзьце малюнкі. Скажыце, чым занятыя дзеці. Складзіце і запішыце сказы па малюнках.





хованкі, жмуркі

Знайдзіце ў сказах назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку або толькі ў форме множнага. Пазначце над словамі, у форме якога ліку яны ўжываюцца.

**97.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце словы-адгадкі. Запішыце загадкі разам з адгадкамі. Якой часцінай мовы з'яўляюцца словы-адгадкі?

с а к і н

1. На горку цягне іх Рыгорка.
   Яны ж вязуць Рыгорку з горкі.

п а р і а в к

2. Яна нам часта сустракаецца:
   зубоў не мае, а кусаецца.

*І. Муравейка.*

Пазначце над словамі-адгадкамі, у форме якога ліку яны заўсёды ўжываюцца.



Спампавана з сайце aversev.by

**98.** Утварыце форму множнага ліку назоўнікаў па ўзоры. Запішыце.

*мыш — мыш*[ы]
шалаш — …
коўш — …
кош — …
ёрш — …

*гараж — гараж*[ы]
чыж — …
стрыж — …
нож — …
вуж — …

*печ — печ*[ы]
ноч — …
урач — …
рэч — …
мяч — …
меч — …

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

**Будзьце ўважлівыя!**

| у беларускай мове | у рускай мове |
|---|---|
| чарніла *(адз. л.)* | чернила *(мн. ч.)* |
| крупы *(мн. л.)* | крупа *(ед. ч.)* |
| паводзіны *(мн. л.)* | поведение *(ед. ч.)* |
| дзверы *(мн. л.)* | дверь *(ед. ч.)* — двери *(мн. ч.)* |


Спампавана з сайте aversev.by

**99.** Прачытайце назоўнікі. На якія дзве групы іх можна падзяліць?

Крупы, гульні, шахматы, фігуры, канікулы, штаны, боты, дзверы, машыны, нажніцы, ніткі, дні, паводзіны.

Выпішыце спачатку назоўнікі, якія маюць формы адзіночнага і множнага ліку.

Выпішыце астатнія назоўнікі. Абазначце, у форме якога ліку яны заўсёды ўжываюцца.

**100.** Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі па сэнсе назоўнікамі. Якія з іх маюць толькі форму адзіночнага ліку, якія — толькі форму множнага ліку?

1. Кошка Мурка любіць цёплае ... . Андрэйку таксама падабаецца запіваць малаком смачнае ... .
2. Раніцай у мамы на пліце заўсёды варыцца ... . Яна любіць дабаўляць у каву ... .
3. Тата паклаў на стол ... і ... . На сняданак ён заўсёды робіць ... з сырам.

Словы для даведкі: *малако, пячэнне, кава, вяршкі́, масла, сыр, бутэрброд*.

бутэрбро́д

**вяршкі́** — *рус.* сливки

Спішыце трэцюю пару сказаў. Абазначце лік устаўленых назоўнікаў.



Спампавана з сайте aversev.by

**101.** Прачытайце. На якія групы можна размеркаваць выдзеленыя словы паводле іх значэння?

Вось табе **кефір, пячэнне,**
**малако, цукерак** жменя,
**пернік, квас, батон** ды **кава** —
што — налева, што — направа?

*С. Шах.*

Якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы?

Выпішыце ў адзін слупок назоўнікі, якія маюць формы адзіночнага і множнага ліку.

Выпішыце ў другі слупок астатнія назоўнікі. Абазначце, у форме якога ліку яны заўсёды ўжываюцца.

**102.** Прачытайце скорагаворку. Спішыце. Абазначце лік выдзеленых назоўнікаў.

Пасярод **двара** — **гара**,
на вяршэчку — **сані**.
А хто што дастане —
гаварыце самі.
Сонечка — **саначкі**,
Верачка — **вяровачку**,
а малы Іваначка —
**скорагаворачку**.

*В. Вітка.*

Падкрэсліце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку.


Спампавана з сайте aversev.by

## Род назоўнікаў

**103.** Разгледзьце малюнак.



Якія рэчы трымаюць дзеці? Што кожны гаворыць пра сваю цацку? Вусна дапоўніце размову дзяцей патрэбнымі словамі.

— Гэта ... . **Ён мой,** — сказаў хлопчык.
— Гэта ... . **Яна мая,** — прамовіла дзяўчынка.
— Гэта ... . **Яно маё,** — выгукнула маленькае дзіця.

Назоўнікі ў форме адзіночнага ліку адносяцца да аднаго з трох родаў: **мужчынскага, жаночага** або **ніякага.**

Да назоўнікаў мужчынскага роду можна падставіць словы ***ён, мой*** (*хлопчык, верталёт*). Да назоўнікаў жаночага роду — ***яна, мая*** (*дзяўчынка, лялька*). Да назоўнікаў ніякага роду — ***яно, маё*** (*дзіця, вядро*).



Спампавана з сайте aversev.by

**104.** Размяркуйце і запішыце назоўнікі ў тры слупкі.

Тата, вясло, лодка, веласіпед, возера, самакат, дзядуля, мыш, поле, бабуля, дзіця, дом, жыццё, цацка, хваля.

Узор: *ён, мой* — тат[а]; *яно, маё* — вясл[о]; *яна, мая* — лодк[а]

Вызначце род назоўнікаў у кожным слупку. Абазначце ў іх канчаткі.

Назоўнікі кожнага роду маюць свае **родавыя канчаткі:**

мужчынскі род (м. р.): *дзядзьк[а], дзядул[я], лес[ ]*;

жаночы род (ж. р.): *сасн[а], яблын[я], печ[ ]*;

ніякі род (н. р.): *акн[о], зерн[е], галл[ё], кацян[я], паветр[а]*.

**105.** Прачытайце. Які настрой перадаецца ў вершы: сур'ёзны ці жартоўны? Якія птушкі адлюстраваны на малюнку?

## Птушкі

Ча́пае **чапля,**
**жораў** жыру́е,
**бусел** у ботах
па лужах вандруе.
Ка́нькае ка́ня.
**Пліска** лятае.

**Дзяцел** стракаты
зязюлю пытае:
— Дзе ты, **зязюля,**
падзела **яечка,**
чаму не паклала
ў сваё ты **гняздзечка**?

*Е. Лось.*



Спампавана з сайте aversev.by



**жыру́е** — шукае ежу, корміцца
**ка́ня** — *рус.* чибис

Выпішыце выдзеленыя назоўнікі. У дужках абазначце іх род.

Узор. *Чапля (ж. р.), ...*

**106.** Прачытайце скорагаворку. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце род назоўнікаў.

У пе.. пчала паставіла піро.. . За павідлам пайшла, а піро.. — за паро.. . *(А. Зэкаў.)*

**?!** Карыстаючыся падказкай, растлумачце, як вызначыць род у форме слова *за павідлам*.

Падказка: *за павідлам* — (ш т о?) *павідла (яно, маё)*.

Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць скорагаворку. Назавіце ў ёй словы, якія адрозніваюцца двума гукамі.



Спампавана з сайте aversev.by

**107.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце. Абазначце род назоўнікаў.

Нічым не запраўлены мясны адвар — гэта … .
Мяса, зваранае ў булёне, называецца … мясам.

*булё**нн**ым*
*булён*

Знайдзіце ў сказах формы аднаго і таго ж назоўніка. Абазначце канчаткі ў гэтых словах.

Знайдзіце ў сказах аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх корань. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**булён**

**108.** Да назоўнікаў мужчынскага роду падбярыце па ўзоры назоўнікі жаночага роду. Запішыце пары слоў.

*Дзядуля — бабуля*, тата — …, дзядзька — …, сын — …, унук — … .
*Плывец — плыўчыха*, ткач — …, настаўнік — …, артыст — …, піяніст — … .
*Баран — авечка*, певень — …, кот — …, казёл — …, ліс — … .

**109.** Прачытайце. Падумайце, чаму назоўнікі размеркаваны на тры групы.

1. Капуста, часнок, пячэнне, малако, кефір.
2. Вёслы, дарогі, дубы, вочы, сталы́.


Спампавана з сайте aversev.by

3. Нажніцы, акуляры, арэлі, джынсы, кансервы.

Запішыце тую групу назоўнікаў, у якой вы можаце вызначыць род. Укажыце род назоўнікаў.

?! Карыстаючыся падказкай, растлумачце, як вызначыць род у другой групе назоўнікаў.

Падказка: *вёслы — вясло (яно, маё)*.

У якіх назоўнікаў вы не змаглі вызначыць род?

Каб вызначыць род назоўніка, які ўжыты ў форме множнага ліку, трэба паставіць яго ў форму адзіночнага ліку, затым падставіць словы ***ён, мой*** *(м. р.)*, ***яна, мая*** *(ж. р.)*, ***яно, маё*** *(н. р.)*: *кнігі — кніга (яна, мая) — жаночы род.*

У назоўнікаў, якія ўжываюцца **толькі ў форме множнага ліку, нельга вызначыць род.**

**110.** Прачытайце. Які настрой перадаецца ў вершы? Чаму?

Мы на дошчачкі паселі
і разгушкалі арэлі.
І цяпер не толькі самі —
сонца гушкаецца з намі.

*Н. Галіноўская.*

Спішыце. Вызначце род назоўнікаў. Падкрэсліце назоўнік, у якім нельга вызначыць род.



Спампавана з сайте aversev.by

**111.** Прачытайце тэкст. Хто такая Ляля? Якой вы сабе яе ўявілі?



У кожнай пары́ **года** ёсць свая **ўлада́рка**. Багі́няй **вясны** лічыцца Ляля. Гэта маладая прыгожая **дзяўчына** ў сукенцы, сатка́най з сонечных **промняў**. За спінай у яе зялёнымі **хвалямі** ўздымаюцца **косы**. Калі з’яўляецца Ляля, **лес** упрыгожваецца **пралескамі**. Яны блакітныя і пяшчотныя, як **вочы** ў багіні вясны. Нездарма пра прывабных і добрых дзяўчат у **народзе** кажуць: «Прыгожая, як Ляля!»

**улада́рка** — гаспадыня

Выпішыце выдзеленыя назоўнікі. Вызначце іх род.



Спампавана з сайте aversev.by

## *Творчая хвілінка*

Ці ведаеце вы, як і калі нашы продкі адзначалі свята ў гонар Лялі? Знайдзіце адказ на гэта пытанне ў інтэрнэце.

**112.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць? Спішыце. Вызначце род назоўнікаў.

Вясну хваляць за дажджы і сонца, а лета — за снапы́ і вазы́.



**сноп** — звязка сцёблаў збажыны

**113.** Спішыце загадку. Дапішыце слова-адгадку.

Зубы маюць,
але не кусаюцца,
лета прыйдзе —
на лузе ўвіха́юцца.
Покуль рукі твае
не аслаблі —
сенам, саломай
не грэ́буюць … .

*М. Чарняўскі.*



**увіха́юцца** — стараюцца
**не грэ́буюць** (сенам, саломай) — *тут:* выконваюць любую работу

Вызначце род назоўнікаў. Падкрэсліце назоўнік, у якім нельга вызначыць род.



Спампавана з сайте aversev.by

**114.** Разгледзьце малюнкі. Скажыце па-руску, што на іх намалявана.



**Мужчынскі род**



**Жаночы род**

Высокая таполя, белы рамонак, залаты медаль, зялёная салата, разумны сабака, шэрая гусь, смачны яблык.

Прачытайце спалучэнні слоў. Выпішыце ў адзін слупок спалучэнні слоў з назоўнікамі жаночага роду, у другі — з назоўнікамі мужчынскага роду.

?! Чаму трэба быць уважлівымі пры вызначэнні роду назоўнікаў у гэтых спалучэннях слоў?

### Будзьце ўважлівыя!

| у беларускай мове | у рускай мове |
|---|---|
| доўгі цень (*м. р.*) | длинная тень (*ж. р.*) |
| шэры пыл (*м. р.*) | серая пыль (*ж. р.*) |
| моцны боль (*м. р.*) | сильная боль (*ж. р.*) |
| прыгожы подпіс (*м. р.*) | красивая подпись (*ж. р.*) |
| высокая жырафа (*ж. р.*) | высокий жираф (*м. р.*) |
| белая па́ра (*ж. р.*) | белый пар (*м. р.*) |



Спампавана з сайте aversev.by

**115.** Дапоўніце сказы патрэбнымі спалучэннямі слоў з рубрыкі «Будзьце ўважлівыя!» на старонцы 68. Запішыце тры сказы на выбар.

1. Ад дрэва на зямлю лёг ... ... . 2. Дзяўчынка зрабіла ... ... пад малюнкам. 3. Машына праехала па дарозе і падняла ... ... . 4. ... ... аб'ядала лісце з дрэва. 5. ... ... падымалася над вадой. 6. ... ... прайшоў, калі Паўлік палячыў зуб.

Знайдзіце ў запісаных сказах назоўнікі, вызначце іх род.

**116.** Прачытайце тэкст па ролях. Каго з герояў размовы можна назваць жартаўнікам, а каго — кемлівым, знаходлівым чалавекам?

## Есць, а не расце

**Дачка** з татам ідуць па парку і сустракаюць жанчыну з пудзелем.

— Бачыш, які **маленькі** сабачка? — кажа тата. — А ўсё таму, што дрэнна есць.

— І зусім не таму, — не пагаджаецца дачка. — Сабачка есць. Ён знаро́к такі маленькі, каб не рос. *(Паводле А. Зэкава.)*

Знайдзіце ў тэксце назоўнікі, вызначце іх род.

Вусна перакладзіце выдзеленыя словы на рускую мову. Чаму трэба звяртаць увагу на вымаўленне выдзеленых слоў?



Спампавана з сайте aversev.by

**117.** Разгледзьце малюнак. Скажыце па-руску, хто на ім намаляваны.



## Ніякі род

Прачытайце спалучэнні слоў.

Маленькае дзіця, прыгожае ягня, чорнае цяля, пародзістае шчаня, спрытнае жарабя, ласкавае кацяня.

Спішыце. Вызначце род назоўнікаў.

?! Чаму трэба быць уважлівымі пры вызначэнні роду назоўнікаў у гэтых спалучэннях слоў?

**118.** Утварыце пары слоў па ўзоры і запішыце. Вызначце род назоўнікаў. Абазначце ў іх суфіксы.

*м. р.* *н. р.*

*Слон — сланяня*, кот — ..., алень — ..., бусел — ..., бобр — ..., тыгр — ... .


Спампавана з сайте aversev.by

**119.** Прачытайце скорагаворку Соф'і Шах па стрэлках і запішыце яе.

У → зубра → зубраня, → у → зебры → зебраня.

**Рм** Прыдумайце і дагаварыце падобныя скорагаворкі.

У ваўка ..., у выдры ... . У ката ..., у казы ... . У слана ..., у савы ... .

Запішыце адну са скорагаворак. Вызначце род назоўнікаў.

**120.** Прачытайце словы. У слупку справа пазнаёмцеся з прыметай, па якой трэба выбраць словы ў кожнай групе.

| | |
|---|---|
| 1. Цень, бобр, боль, конь, жырафа. | м. р. |
| 2. Гусь, сукенка, салата, медаль. | ж. р. |
| 3. Бусляня, коцік, жарабя, кацяня. | н. р. |

Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго вусна.

**121.** Прачытайце тэкст. Як кацяняты пачынаюць вучыцца паляваць?

К..цяняты часта круцяцца вакол свайго хв..ста. Спрабуюць ухапі..ь яго лапкамі, зубамі.



Спампавана з сайце aversev.by

Гэта не проста забава. Так ка..яняты вучацца паляваць. З дапамогай хв..ста яны трэнірую..ь дакладныя рухі.

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Вызначце род назоўнікаў.

**122.** Прачытайце. Формы якога назоўніка ёсць у кожным сказе? Вусна пастаўце да іх пытанні ад выдзеленых слоў.

(...?)

У заапарку **жыве** маленькая казуля. Ганначка

(...?)

яшчэ **не бачыла** казулі. Дзеці падрыхтавалі **пача-**

(...?) (...?)

**стунак** казулі. У вальеры яны **заўважылі** казулю.

(...?)

Усе **любаваліся** маленькай казуляй. Поўсць пры-

(н а ...?)

гожа **блішчыць** на казулі.

Выпішыце назоўнік *казуля* разам са словамі, ад якіх ставілі пытанні. Абазначце канчаткі назоўнікаў.

Узор. *Жыве* (х т о?) *казул*[*я*], ...



Спампавана з сайте aversev.by

**123.** Прачытайце. Формы якога назоўніка ёсць у прыказках? Пастаўце да іх пытанні ад выдзеленых слоў.

1. Хараство прыглядзіцца, а розум **спатрэбіцца**. 2. Сустракаюць па адзенні, а **праводзяць** па розуме. 3. Мудры свайго розуму **не паказвае.** 4. Чужым розумам **не пражывеш**. 5. І жывёла розум **ма́е**, дарма што не гаворыць.

У сказе назоўнікі звязваюцца з іншымі словамі і змяняюць сваю форму. Яны могуць адказваць на пытанні х т о? ш т о? к а г о? к а м у? к і м? і іншыя:

*спатрэбіцца* (ш т о?) ***розум***;
*не паказвае* (ч а г о?) ***розуму***;
*дзівіўся* (ч а м у?) ***розуму***;
*мае* (ш т о?) ***розум***;
*не пражывеш* (ч ы м?) ***розумам***;
*праводзяць* (п а ч ы м?) ***па розуме***.

**124.** Падбярыце блізкія па значэнні спалучэнні слоў па ўзоры. Па стрэлках пастаўце пытанні да назоўнікаў.

*любіць прыроду — любоў да прыроды*

цікавіцца кнігай — цікавасць … …

спачуваць бабулі — спачуванне … …



Спампавана з сайте aversev.by

**125.** Прачытайце верш. Назоўнік у дужках пастаўце ў патрэбнай форме.

Склалі песеньку мы самі.
Наша **песенька** пра *(мама)*.
*(Мама)* песню **заспявае,**
сум адразу прападае.
*(Мама)* **можа** ўсё на свеце,
з *(мама)* **добра** яе дзецям.
*І. Муравейка.*

**сум** — смутак, маркота (*рус*. грусть)

Спішыце, раскрываючы дужкі. Ад выдзеленых слоў пастаўце пытанні да назоўніка *мама*. Над рознымі формамі гэтага назоўніка запішыце пытанні, на якія яны адказваюць. Абазначце канчаткі назоўніка *мама*.

**126.** Спішыце. Дапоўніце сказы назоўнікам *рабіна* ў патрэбнай форме.

Каля нашага дома **расце** … . Гэту … **пасадзіў** мой дзядуля. Вясной … **упрыгожваюць** белыя кветкі. Летам пад … **можна схавацца** ад сонца. Восенню на … **чырванеюць** ягады. Зімой птушкі **прылятаюць** на … паласавацца імі.

Ад выдзеленых слоў вусна пастаўце пытанні да назоўніка *рабіна*. Абазначце канчаткі ў розных формах гэтага назоўніка.


Спампавана з сайте aversev.by

**127.** Прачытайце тэкст. Назоўнік у дужках пастаўце ў патрэбнай форме. Як грыбнік дапамог мухамору? Як грыб падзякаваў чалавеку?



На ўскрайку лесу **вырас** вялікі *(мухамор)*. Над *(мухамор)* **тырчала** сухая галінка сасны. Грыб упіраўся ў яе шапкай. Галінка **перашкаджала** *(мухамор)*.

Я **прысеў** перад *(мухамор)* і зламаў яе. Грыб вызваліўся, хіснуўся ўбок. **Пад** шырокай **шапкай** *(мухамор)* я ўбачыў крамя́ны баравік. *(Паводле В. Хомчанкі.)*

**крамя́ны** — пругкі, моцны

Выпішыце з тэксту сказы, у якіх ёсць назоўнік *мухамор*. Ад выдзеленых слоў вусна пастаўце пытанні да яго. Абазначце канчаткі ў розных формах гэтага назоўніка. Падкрэсліце прыназоўнікі, з якімі ўжываецца слова *мухамор*.

**Будзьце ўважлівыя!**

ву́лей *(адз. л.)* — вуллі́ *(мн. л.)*

вылецелі з вулля́, вылецелі з ву́лея,

шмат вуллёў



Спампавана з сайте aversev.by

**128.** Дапоўніце народныя прыкметы слоўнікавым словам у патрэбнай форме. Ад выдзеленых слоў вусна пастаўце пытанні да слоўнікавага слова.

Калі ўлетку дождж рэдка бывае, то ў  мёд **прыбывае.**

Пчолы **не вылазяць** з  — на туман.

Ранні **вылет** пчол з  — да ранняй і цёплай вясны.

Запішыце адзін сказ на выбар. Падкрэсліце прыназоўнік, з якім ужываецца слова *вулей*.

**ву́лей**

**129.** Дапоўніце скорагаворку слоўнікавым словам у патрэбнай форме. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.




Пчала чапялою чмяля
пачала выганяць з ... .
Чмель ёй кажа:
— Пачакайце!
Пачастунку — мёду — дайце!
А пчала не частавала —
прэч з ...
чмяля прагнала.

*П. Саковіч.*

Запішыце па памяці першы сказ. Падкрэсліце назоўнікі, вызначце іх род, абазначце канчаткі.



Спампавана з сайте aversev.by

Рм **130.** Прачытайце прыказкі. Якая з іх падказвае, што кожны павінен працаваць, а якая — што ў калектыве любую справу рабіць лягчэй?

Малая пчолка, ды і тая працуе.
За пчолкаю — у мёд, за жуком — у бруд.
Пчолкі па адной не селяцца.

**бруд** — гразь

Вызначце лік назоўніка *пчолка* ў сказах.

**131.** Прачытайце. Назоўнік у дужках пастаўце ў патрэбнай форме. Ад выдзеленых слоў вусна пастаўце пытанні да яго.

## Ку́хары

З Вовам *(каша)* мы **варылі** —
кацялок перакулілі.
І маркотна Вова кажа:
— Ой, як **шко́да** смачнай *(каша)*!
Засталося мала круп…
Замест *(каша)* **зварым** суп!

*Я. Крупенька.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце канчаткі ў розных формах назоўніка *каша*.

**шко́да** — шкада́ (*рус.* жаль)



Спампавана з сайте aversev.by

# Прыметнік

**132.** Прачытайце тэкст. Ці зразумела з яго, як выглядае божая кароўка?



Па сцяблінцы рамонка паўзла ... **кароўка**. Якая **яна** ...! **Вусікі** ў кароўкі ... . Сама **яна** ..., як сунічка. На крыльцах у жучка шэсць ... **кропачак**.

Словы для даведкі: *прыгожая, божая, кароткія, чырвоная, чорных.*

Дапоўніце тэкст патрэбнымі словамі, каб атрымалася апісанне божай кароўкі.

Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя словы. Вусна пастаўце да іх пытанні ад выдзеленых слоў.

**133.** Пазнайце прадметы па апісанні. Дапішыце ў спалучэнні слоў патрэбныя назоўнікі.



Шэры, злосны, галодны ... .
Рыжая, хітрая, кемлівая ... .
Жоўтае, маленькае, пушыстае ... .
Працавітыя, маленькія, дружныя ... .







Вусна пастаўце пытанні ад назоўнікаў да слоў — назваў прымет прадметаў.



Спампавана з сайте aversev.by

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў і адказваюць на пытанні *які? якая? якое? якія?*, — гэта **прыметнікі.**

**134.** Прачытайце сказы. Прыметнік у дужках пастаўце ў патрэбную форму.

1. Паліна апранула на вуліцу *(цёплы)* куртку. 2. Раніцай прайшоў *(цёплы)* дождж. 3. Бабуля пачаставала ўнукаў *(цёплы)* булачкамі. 4. *(Цёплы)* сонейка высушыла зямлю.

Спішыце адзін сказ на выбар, раскрываючы дужкі. Разбярыце яго па членах сказа. З якім словам у сказе звязаны прыметнік? Якім членам сказа з'яўляецца прыметнік?

Прыметнік у сказе звязваецца з назоўнікам. Ён часцей бывае даданым членам сказа:

якое?

***Маленькае кацяня грэлася на сонейку.***

**135.** Прыдумайце сказы, якія адпавядаюць наступнай схеме. Назавіце ў сказах прыметнікі.






Спампавана з сайте aversev.by

**136.** Да назоўнікаў з правага слупка падбярыце прыметнікі з левага слупка.



| | |
|---|---|
| пясчаны<br>пясочны | гадзіннік<br>бераг |
| каме́нная<br>камяністая | дарога<br>вежа |
| лясное<br>лясістае | месца<br>возера |





Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія падыходзяць па сэнсе.

1. Мы выйшлі на … … ракі. 2. На ўзгорку стаяла … … . 3. Свіцязь — гэта вялікае … … з чыстай вадой.

**пясча́ны**

Запішыце сказ, у якім ёсць слоўнікавае слова.

**137.** Знайдзіце ў кожнай групе прыметнікаў лішні.

1. Маленькі, дробны, вялікі, невялікі.
2. Шпаркі, павольны, хуткі, быстры.

Дапоўніце сказы словамі першай групы і запішыце.

Пачаўся … дождж. … хлопчык апрануў куртку і выйшаў на вуліцу. Да яго падбег … сабачка.



Спампавана з сайте aversev.by

**138.** Прачытайце. Спішыце першую і другую часткі тэксту. Падкрэсліце прыметнікі. Знайдзіце сярод іх антонімы.

У Андрэйкі ёсць сабака Буян — чорны, як вугаль, і калматы, як баранчык. Смешны і прыгожы.

Ёсць яшчэ кот Андрыян — белы, як вата, і з кароткай поўсцю.

Такія непадобныя адзін да аднаго, а дружбакі — **вадой не разальеш.** *(Паводле І. Муравейкі.)*

Як вы разумееце сэнс выдзеленага выразу?

## Змяненне прыметнікаў па родах

**139.** Апішыце пры дапамозе прыметнікаў *прыгожы*, *вялікі* прадметы на малюнках.







Запішыце спалучэнні слоў, якія атрымаліся. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**?!** Як вы думаеце, чаму яны змяніліся? Вызначце род і лік назоўнікаў у спалучэннях слоў. Вусна пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў.



Спампавана з сайте aversev.by

Прыметнікі змяняюцца **па родах.** Прыметнікі стаяць у тым жа родзе, што і назоўнікі, з якімі яны звязаны па сэнсе.

**140.** Разгледзьце табліцы.

| **Мужчынскі род**<br>я к і?<br>канчаткі **-ы**, **-і** | **Жаночы род**<br>я к а я?<br>канчаткі **-ая**, **-яя** |
|---|---|
| ***добр*ы** *хлопчык*<br>***сін*і** *колер*<br>***лясн*ы** *звер* | ***добр*ая** *бабуля*<br>***сін*яя** *суkенка*<br>***лясн*ая** *птушка* |

| **Ніякі род**<br>я к о е?<br>канчаткі **-ое**, **-ае**, **-яе** |
|---|
| ***лясн*ое** *возера*<br>***добр*ае** *сэрца*<br>***сін*яе** *неба* |

На якія пытанні адказваюць прыметнікі ў форме мужчынскага, жаночага, ніякага роду? Якія яны маюць канчаткі?

У форме якога ліку ўжыты назоўнікі ў спалучэннях слоў?



Спампавана з сайте aversev.by

**141.** Прачытайце спалучэнні слоў. Запішыце. Пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў. Вызначце род прыметнікаў, абазначце канчаткі.

Сіняе неба, ласкавае сонейка, цёмная хмара, цёплы дождж, свежае паветра, моцны град, белы туман, рознакаляровая вясёлка.

я к о е?

Узор. *Сін[яе] (н. р.) неба, …*

З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце і запішыце сказ.

**142.** Прачытайце загадкі. З літар, якія «схаваліся» на малюнках, складзіце адгадкі. Якія прыметнікі дапамаглі вам знайсці адгадкі? Вызначце іх род, назавіце канчаткі.

1. Кругленькае, ды не яечка,
цёпленькае, ды не гняздзечка,
здаецца, побач, як глянеш,
а яго не дастанеш.

*У. Карызна.*



2. Цёплы ці халодны —
снегу брат ён родны.
Там, дзе ходзіць ён,
трэба парасон.

*С. Шах.*



Спішыце адну загадку на выбар.



Спампавана з сайте aversev.by

**143.** Прачытайце і запішыце прыказку, карыстаючыся падказкай. Чаму так гавораць?

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Н | д | а | р | о | к | а | к | а. |
| е | я | а | м | г | а | н | ы | з |
| в | я | д | о | а | н | ц | ы | я |



Знайдзіце ў прыказцы прыметнік. З якім назоўнікам ён звязаны? Вызначце род прыметніка, абазначце канчатак.

**144.** Прачытайце тэкст. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх род.



Стаіць ясны в..снавы́ дзень. На лузе пасвяцца каровы. За лугам ра..кінулася нев..лікае прыгожае воз..ра.

Каля берага над вадой цягнецца тонкая жоўтая стужка. Гэта цвіце лотаць балотная.



Спампавана з сайте aversev.by

**145.** Падбярыце і запішыце блізкія па значэнні спалучэнні слоў па ўзоры.

*пірог з чарніцамі — чарнічны пірог*
варэнне з суніц — ... ...

*джэм з ажын — ажынавы джэм*
кампот з малін — ... ...

*блюда са шкла — шкляное блюда*
сцяна з цэглы — ... ...

Вызначце род прыметнікаў. Абазначце ў іх канчаткі. З адным спалучэннем слоў складзіце клічны сказ.

**146.** Далучыце прыметнікі да назоўнікаў. Запішыце спалучэнні слоў, якія атрымаліся. Вызначце род прыметнікаў. Абазначце ў іх канчаткі.

Добр.. (*чалавек, імя, справа*); высок.. (*будынак, дрэва, узнагарода*); залат.. (*пярсцёнак, сэрца, восень*).

**Рм** У якіх спалучэннях слоў прыметнікі ўжыты ў пераносным значэнні? Як вы разумееце значэнне гэтых выразаў?

**147.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць? Назавіце ў іх прыметнікі-антонімы.

Вялі́кага дуба з малым карэннем не бывае.
З малой іскры бывае вялікі пажар.



Спампавана з сайте aversev.by

?! Карыстаючыся падказкай, растлумачце, як вызначыць род гэтых прыметнікаў.

Падказка: *вялікага дуба — вялікі дуб — дуб (ён, мой) — м. р.*

Падрыхтуйцеся пісаць другую прыказку пад дыктоўку.

**148.** Прачытайце і адгадайце загадку. Знайдзіце прыметнікі, вызначце іх род.

Снежная горка
ў полі блакітным
кіруецца лёгка
ветрыкам спрытным.

*С. Шах.*



**149.** Спішыце верш, устаўляючы патрэбныя літары. Знайдзіце прыметнікі, вызначце іх род.

### Лясное возера

*(Ц/т)*ёплае, прыветнае
возера летняе,
ч*(і/ы)*стая ва*(д/дз)*іца,
хочацца напіцца.
А каб не зм*(я/е)*ле́ла
возера л*(я/е)*сное,
поўняць яго хмаркі
в*(а/о)*дой д*(а/о)*жджавою.

*Я. Крупенька.*



Спампавана з сайте aversev.by

**150.** У спалучэннях слоў замяніце прыметнікі на супрацьлеглыя па сэнсе. Карыстайцеся словамі для даведкі.

Адчайны чалавек, сумны настрой, чарнявая дзяўчынка, лёгкая сумка, мяккае крэсла.

Словы для даведкі: *асц..рожны, б..лявая, в..сёлы, ц..жкая, цвёрдае.*

Запішыце спалучэнні слоў, якія атрымаліся. Вызначце род прыметнікаў. Растлумачце правапіс прапушчаных літар.

**151.** Прачытайце тэкст. На што падобныя ягады малін?



## Маліны

Як прыемна ліпеньскім днём збіраць маліны! Нават нагінацца не трэба. Густы малліннік паднімаецца ў рост чалавека. Кусты малін усыпаны ягадамі. Здалёк яны нагадваюць чырвоную гірлянду. Адна асало́да пакласці ў рот спелую пахучую ягадку!

**асало́да** — задавальненне, адчуванне прыемнага

Выпішыце прыметнікі разам з назоўнікамі, з якімі яны звязаны па сэнсе. Вызначце род прыметнікаў.



Спампавана з сайте aversev.by

**152.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння роду прыметніка ў сказе.

*Як прыемна* ***ліпеньскім*** *днём збіраць маліны!*

**1. Знаходзім назоўнік, з якім … .**

*Як прыемна ліпеньскім* ***днём*** *збіраць маліны!*

**2. Вызначаем … .**

***Днём*** *— дзень (ён, мой) — м. р.*

**3. Вызначаем … .**

*м. р.*
***Ліпеньскім*** *днём.*

**153.** Прачытайце. Назоўнікі ў дужках замяніце аднакаранёвымі прыметнікамі. Складзіце спалучэнні слоў «прыметнік + назоўнік». Запішыце іх.

*(Месца)* жыхар, *(зоры)* неба, *(дождж)* раніца, *(поўнач)* вецер, *(ураджай)* год, *(сонца)* надвор'е, *(спорт)* пляцоўка, *(сасна)* лес, *(горад)* плошча, *(вёска)* вуліца, *(жыта)* поле, *(колер)* аловак, *(гара)* возера.

*м. р.*
Узор. *Мясцовы жыхар, …*

Вызначце род прыметнікаў. Абазначце ў іх канчаткі.

З адным спалучэннем слоў на выбар прыдумайце сказ.



Спампавана з сайте aversev.by

**154.** Прачытайце. Спішыце, устаўляючы патрэбныя канчаткі прыметнікаў. Вызначце род прыметнікаў.

Дажджав.. воблака — дажджлів.. дзень, балотн.. трава — балоціст.. месца, **конн..** спорт — **конск..** грыва, водн.. гладзь — вадзян.. расліна, глінян.. посуд — гліністо.. глеба.

❖ Разбярыце па саставе выдзеленыя прыметнікі.

## Змяненне прыметнікаў па ліках

**155.** Назавіце прадметы на малюнках. Прачытайце подпісы пад імі.



зялёная галінка
маленькі верабейка
пшанічнае зярнятка



зялёныя галінкі
маленькія верабейкі
пшанічныя зярняткі

Назавіце спалучэнні слоў з назоўнікамі ў форме адзіночнага ліку. Падумайце, у форме якога ліку ўжыты звязаныя з імі прыметнікі.



Спампавана з сайте aversev.by

Запішыце спалучэнні слоў з назоўнікамі ў форме множнага ліку. Падумайце, у форме якога ліку ўжыты звязаныя з імі прыметнікі.

Пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

Прыметнікі змяняюцца **па ліках**. У множным ліку яны адказваюць на пытанне я к і я? і маюць канчаткі ***-ія, -ыя***. Прыметнікі стаяць у тым жа ліку, што і назоўнікі, з якімі яны звязаны па сэнсе.

**156.** Далучыце прыметнікі да назоўнікаў.

**добр..** → хлопчык, бабуля, сэрца

**сін..** → фламастар, сукенка, возера

**добр..** → хлопчыкі, бабулі, сэрцы

**сін..** → фламастары, сукенкі, азёры

Запішыце спалучэнні слоў з левага слупка. Чаму прыметнікі ў іх маюць розныя канчаткі? Па назоўніках вызначце род і лік прыметнікаў.

Запішыце астатнія спалучэнні слоў. Абазначце канчаткі прыметнікаў. Па назоўніках вызначце лік прыметнікаў.

У прыметнікаў множнага ліку род не вызначаецца.


Спампавана з сайте aversev.by

**157.** Змяніце спалучэнні слоў па ўзоры і запішыце. Вусна пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў.

*адз. л., ж. р.* *мн. л.*

*Прыгож***[ая]** *кветка* — *прыгож***[ыя]** *кветкі*, сонечны дзень — … …, жытнёвае поле — … …, цёмная хмара — … …, гучны голас — … …, вялікае возера — … … .

Абазначце канчаткі прыметнікаў, вызначце іх лік. У прыметнікаў у форме адзіночнага ліку вызначце род.

**158.** Прачытайце. Назоўнікі ў дужках замяніце аднакаранёвымі прыметнікамі. Складзіце спалучэнні слоў «прыметнік + назоўнік». Запішыце іх.

*(Дрэва)* граблі, *(рыс)* крупы, *(лета)* канікулы, *(сонца)* акуляры, *(жалеза)* нажніцы, *(дуб)* дзверы.

*мн. л.*

Узор. *Драўлян***[ыя]** *граблі*, …

Вызначце лік прыметнікаў. Абазначце ў іх канчаткі.

**159.** Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

Калматыя, густыя
і колерам — сівы́я.
Ад іх на светлы дзень
кладзецца шэры цень.
*С. Шах.*






Спампавана з сайте aversev.by

Спішыце загадку. Знайдзіце прыметнікі, вызначце іх лік. У прыметнікаў у форме адзіночнага ліку вызначце род.

Падбярыце антонімы да прыметнікаў *светлы*, *густыя*.

**160.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Свет не без добрых людзей.
Добрым людзям і мы рады будзем.

Які прыметнік сустракаецца ў абедзвюх прыказках?

**?!** Карыстаючыся падказкай, растлумачце, як вызначыць лік гэтага прыметніка.

**Падказка:** *добрых людзей — добрыя людзі (мн. л.)*.

Запішыце па памяці адну з прыказак.

**161.** Прачытайце верш. На што падобныя шпакі ў небе?

## Чародка шпакоў

Спевы птушыныя,
клёкат і шчэбет
звонка даносяцца
з розных бакоў.

Вышыла крыжыкам
сіняе неба,
быццам сурвэтку,
чародка шпакоў.

*В. Міхно.*

Спішыце. Знайдзіце прыметнікі, вызначце іх лік. У прыметніка ў форме адзіночнага ліку вызначце род.



Спампавана з сайте aversev.by

**162.** Прачытайце тэкст. Якая пара года апісваецца?

## Зоркі ў траве

Пасля дажджу дыхалася лёгка, на ўсе грудзі.

Лес пазелянеў. Не пазнаць яго вясной. Бярозкі прыбраліся ў **зялёныя** касынкі. Таполі і вольхі павыстаўлялі на сонца **кво́лыя ліпкія** лісточкі.

За альша́нікам каля дарогі звонка пералівалася ручаінка. Каля яе было многа чаромхі. Сюды з усёй акругі паспелі ўжо зляцецца салаўі.



Уся трава скрозь усеяна **маленькімі** зорачкамі. Як усё роўна насыпалі іх сюды з **высокага** неба.

Гэта ў траве незабудкі цвілі. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**кво́лыя** — слабыя
**альша́нік** — зараснікі вольхі

Знайдзіце апісанне вясновага лесу. Каго нагадваюць дрэвы? Якія словы вам гэта падказалі? З чым параўноўваюцца незабудкі?

Выпішыце з тэксту выдзеленыя прыметнікі разам з назоўнікамі, з якімі яны звязаны па сэнсе. Вызначце лік прыметнікаў, абазначце ў іх канчаткі. У прыметніка ў форме адзіночнага ліку вызначце род.

На колькі частак можна падзяліць гэты тэкст?



Спампавана з сайте aversev.by

**163.** Прачытайце план тэксту. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак тэксту з практыкавання 162?

План

1. Вясновы лес.
2. Паветра пасля дажджу.
3. Дыван з незабудак.
4. Салаўі над ручаінкай.

Аднавіце паслядоўнасць пунктаў плана і запішыце выпраўлены план.

**164.** Вусна перакажыце тэкст па выпраўленым плане з практыкавання 163. Выкарыстайце прапанаваныя словы і спалучэнні слоў.

1. Дыхалася лёгка, на ўсе грудзі.
2. Пазеляняеў, не пазнаць яго, прыбраліся, зялёныя касынкі, **таполі**, вольхі, павыстаўлялі, кволыя ліпкія лісточкі.
3. За альшанікам, звонка пераліваласся, многа чаромхі, з усёй акругі, паспелі зляцецца.
4. Усеяна зорачкамі, як усё роўна насыпалі, з высокага неба, цвілі.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае слова? Вызначце яго род.

Рм **165.** Пісьмова перакажыце тэкст з практыкавання 162.



Спампавана з сайте aversev.by

# Дзеяслоў

**166.** Разгледзьце малюнак. Раскажыце, што робіць кожны з членаў сям'і ў выхадны дзень.



Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Што абазначаюць гэтыя словы? На якія пытанні яны адказваюць?

Бабуля … шалік. Дзядуля … газету. Тата з сынам … у шахматы. Мама … дачушку. Дачушка … ляльку.

Словы для даведкі: *чытае, вяжа, гуляюць, закалыхвае, расчэсвае.*

Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў і адказваюць на пытанні што робіць? што робяць? што рабіў? што зрабіў? што будзе рабіць? што зробіць? і іншыя, — гэта **дзеясловы**.



Спампавана з сайте aversev.by

**167.** З асобных слоў складзіце сказы. Запішыце адзін сказ на выбар. Разбярыце яго па членах сказа.

Бабуля, прыгожую, пашыла, сукенку, Юлі.
Дзядуля, унуку, зрабіў, змея, паветранага.

Якім членам сказа з'яўляецца дзеяслоў?

Дзеяслоў у сказе часцей бывае выказнікам:
ш т о з р а б і л а?
*Мама* ***заплята*** *дачушцы прыгожую коску.*

**168.** Прачытайце верш. Чым падобны хлопчык на свайго прадзеда? Чаму радуецца прадзед?



**У майстэрні**

Толік з прадзедам сябруе.
У майстэрню завітае —
і пілуе, і габлюе,
робіць дзіркі, выразае...
Прадзед гляне — усміхнецца:
«Штосьці маё перадаецца».

*А. Зэкаў.*

Знайдзіце ў вершы дзеясловы. Спачатку выпішыце тыя, якія адказваюць на пытанне ш т о р о б і ц ь?, потым — на пытанне ш т о з р о б і ц ь?

Узор. Ш т о р о б і ц ь? *Сябруе*, ...
Ш т о з р о б і ц ь? *Завітае*, ...


Спампавана з сайте aversev.by

**169.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Век жывеш, век вучышся.
Колькі робіш — столькі вучышся.

Знайдзіце дзеясловы, вусна пастаўце да іх пытанні. Запішыце адну з прыказак па памяці.

**170.** Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

т р б у а э а к т

Яна ў кватэры кожнаму годзіць.
Чатыры ножкі, але не ходзіць.
Па ўсіх пакоях яе цягаюць,
а як паставяць — наверх сядаюць.

*А. Кудласевіч.*

Запішыце загадку разам з адгадкай. Знайдзіце і падкрэсліце дзеясловы. Вусна пастаўце да іх пытанні.

**171.** Да дзеясловаў з левага слупка падбярыце супрацьлеглыя па сэнсе дзеясловы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| ад’ехаць | зацвітаць |
| адцвітаць | пад’ехаць |
| адкапа́ць | закапа́ць |
| абрадавацца | засмуці́цца |

**адцвіта́ць**

У дзеясловах абазначце прыстаўкі, растлумачце іх правапіс. Са слоўнікавым словам складзіце і запішыце сказ.



Спампавана з сайте aversev.by

**172.** Прачытайце тэкст. Што выклікала ў вас усмешку? Чаго не ведала маленькая Яна?

Неба зацягнулі хмары. Раз-по́раз бліскае маланка.

Маленькая Яна прыбегла з двара ў хату і пытае:

— Бабуля, хто гэта сваволіць? То ўключыць святло, то выключыць. *(К. Сосна.)*

**раз-по́раз** — раз за разам, зноў і зноў, пастаянна

Выпішыце з тэксту дзеясловы. Знайдзіце сярод іх антонімы і абазначце ў іх прыстаўкі.

**173.** Знайдзіце ў кожнай групе дзеясловаў лішні. Якая прымета аб'ядноўвае астатнія словы ў кожнай групе? Запішыце гэтыя словы.

1. Грэлася, усміхалася, саграваласа, награвалася.
2. Падняўся, гудзеў, узняўся, усхапіўся.
3. Сохне, абсыхае, высыхае, вісіць.

**Рм** Вусна дапоўніце сказы словамі другой групы.

1. Данік ... з-за стала і падзякаваў матулі. 2. Тата адпусціў кітайскі ліхтарык, і той ... высока над зямлёй. 3. Хлопчык ... з месца і хутка прыбег на дапамогу кацяняці.



Спампавана з сайте aversev.by

**174.** Дапоўніце пары сказаў адным і тым жа дзеясловам. Карыстайцеся малюнкамі-падказкамі. Запішыце сказы, у якіх дзеясловы ўжываюцца ў пераносным значэнні.

Як хутка ... час!
Спартсмен ... па стадыёне.






У лесе ... воўк.
За акном ... вецер.

Падкрэсліце ў запісаных сказах дзейнік і выказнік.

**175.** Да дзеясловаў з левага слупка падбярыце назоўнікі з правага слупка.

| | |
|---|---|
| адчыніць | вочы |
| расплюшчыць | падручнік |
| разгарнуць | дзверы |

З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце і запішыце сказ.

**176.** Спішыце загадкі, устаўляючы патрэбныя літары. Дапішыце словы-адгадкі.

1. Моцна хмару *(з/с)*трасянуў —
навет дождж з яе лінуў!



Спампавана з сайте aversev.by

Учыніў на ёй пагром.
Вось такі ён грозны … .

2. Хто аблокі век ганяе
і вандруе па плане*(ц/т)*е?
А з лістотай хто гуляе?
Здагадаўся? Гэта … .

*С. Быкава.*

Падкрэсліце дзеясловы. Вусна пастаўце да іх пытанні. Растлумачце правапіс літар, якія ўставілі.

## Адзіночны і множны лік дзеясловаў

**177.** Параўнайце сказы ў слупках. Выпішыце з іх дзейнік і выказнік. Пастаўце пытанне ад дзейніка да выказніка. Абазначце канчаткі дзеясловаў.

| | |
|---|---|
| Каля школы расце вялікая бяроза. | Каля школы растуць вялікія бярозы. |
| Вучань назірае за птушкай на бярозе. | Вучні назіраюць за птушкамі на бярозах. |

Узор. *Бяроза* (ш т о  р о б і ц ь?) *расц*[*е*]. — *Бярозы* (ш т о  р о б я ц ь?) *раст*[*уць*].

Якія дзеясловы абазначаюць дзеянне аднаго прадмета? Якія дзеясловы абазначаюць дзеянне некалькіх прадметаў?


Спампавана з сайте aversev.by

Дзеясловы змяняюцца **па ліках.** Дзеясловы ў форме **адзіночнага ліку** абазначаюць дзеянне аднаго прадмета. Дзеясловы ў форме **множнага ліку** абазначаюць дзеянне некалькіх прадметаў.

**178.** Дапоўніце сказы з тэксту дзеясловамі ў патрэбнай форме.

Раніцай *(узняўся, узняліся)* моцны вецер. На небе *(паплылі́, паплыла́)* дажджавыя хмары. *(Пырснулі, пырснула)* першыя кроплі дажджу. Але хутка неба *(ачысцілася, ачысціліся)* ад хмар.

Сонечны зайчык *(дацягнуўся, дацягнуліся)* да твару дзяўчынкі. Юлька салодка *(пацягнулася, пацягнуліся)* і *(адкрыла, адкрылі)* вочкі. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

Спішыце першую частку тэксту. Абазначце лік дзеясловаў.

**179.** Спалучыце назоўнікі з дзеясловамі і складзіце сказы. Падкрэсліце тыя дзеясловы, якія ўжыты ў пераносным значэнні. Вызначце іх лік.

Узор. *Песні гучаць. Песні льюцца* (*мн. л.*).

Песні *(гучаць, льюцца)*. Сонейка *(смяецца, свеціць)*. Мора *(шуміць, хвалюецца)*. Ручайкі *(цякуць, бягуць)*.



Спампавана з сайте aversev.by

**180.** Прачытайце і запішыце скорагаворку Васіля Жуковіча, карыстаючыся падказкай.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Л | ь. | Л | і | н | в | е | у | ц | ь | і | м | ы. |
| е | н | е | п | у | і | н | н | х | л | ы | а | н |
| т | а, | л | і | ў | л | ь. | П | а | і | п | л | і |



Знайдзіце ў ёй дзеясловы, вызначце іх лік.

**181.** Прачытайце словы. У слупку справа пазнаёмцеся з прыметай, па якой трэба выбраць словы ў кожнай групе.

1. Смяюцца, скачуць, слухаюць, спявалі, ходзіць.
2. Думае, лятала, кажуць, адказвае, бачыла.

мн. л.

адз. л.

Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго пісьмова.

**182.** Выберыце правільнае выказванне і прадоўжыце яго.

Назоўнік **чарніла** спалучаецца з дзеясловам
а) **ка́пала** ў форме адзіночнага ліку, таму што…
б) **капалі** ў форме множнага ліку, таму што…



Спампавана з сайте aversev.by

**183.** Дапоўніце прыказкі словамі, супрацьлеглымі па сэнсе выдзеленым дзеясловам. Чаму так гавораць?

Згода **будуе**, нязгода … .
**Хваляць** за добрае, … за кепскае.

гáняць
руйнуе

**гáняць** — няслaвяць, асуджаюць (*рус.* осуждают)

Запішыце прыказкі. Вызначце лік дзеясловаў.

**184.** Прачытайце. Які настрой перадаецца ў вершы: сур'ёзны ці жартоўны? Чым тлумачыць аўтар адсутнасць улову ў хлопчыка?

## Рыбак

Ля ракі ся*(д/дз)*іць Антон.
Ву*(д/дз)*іць рыбу ў рэчцы ён.
У вадзе трымці́*(т/ц)*ь кручок.
На кручку тым — чарвячок.
Хо*(д/дз)*яць плоткі ля кручка,
не кранаю*(т/ц)*ь чарвячка.
Мо шапнуў ім чарвячок,
што на іх клюе кручок?

*А. Зэкаў.*

**трымці́ць** — дрыжыць

Спішыце апавядальныя сказы, устаўляючы патрэбныя літары. Знайдзіце дзеясловы, вызначце іх лік.


Спампавана з сайте aversev.by

## Час дзеясловаў

**185.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце сказы. Якія сказы падыходзяць да кожнага малюнка?







1. Мама і Даша **пяклі** торт. Яны **ўпрыгожылі** торт рознымі ягадамі.
2. Мама і Даша **пякуць** торт.
3. Мама і Даша **будуць пячы́** торт. Яны **ўпрыгожаць** торт рознымі ягадамі.

У якіх сказах гаворыцца пра падзеі, якія адбываюцца зараз? Адбываліся раней? Адбудуцца пазней?

Выпішыце са сказаў дзеясловы. Вусна пастаўце да іх пытанні. Якія з дзеясловаў абазначаюць дзеянні, што адбываюцца зараз? Адбываліся раней? Адбудуцца пазней?

Дзеясловы могуць перадаваць **час дзеяння** — цяперашні, прошлы і будучы. Дзеясловы ў форме **цяперашняга часу** абазначаюць дзеянне, якое адбываецца зараз. Дзеясловы ў форме **прошлага часу** абазначаюць дзеянне, якое адбывалася раней. Дзеясловы ў форме **будучага часу** абазначаюць дзеянне, якое адбудзецца пазней.



Спампавана з сайте aversev.by

**186.** Разгледзьце табліцы.

| **Прошлы час** | **Цяперашні час** |
|---|---|
| што рабіў? *чытаў* што зрабіў? *прачытаў* | што робіць? *чытае* што робяць? *чытаюць* |

| **Будучы час** |
|---|
| што будзе рабіць? *будзе чытаць* што зробіць? *прачытае* што будуць рабіць? *будуць чытаць* што зробяць? *прачытаюць* |

На якія пытанні адказваюць дзеясловы цяперашняга часу? Прошлага часу? Будучага часу?

**187.** Змяніце дзеясловы па пытаннях. Вызначце іх час.

*што рабіў? — што робіць? — што будзе рабіць?*

віншаваў *(пр. ч.)* — віншуе *(цяп. ч.)* — будзе віншаваць *(буд. ч.)*

спяваў — … — …

сустракаў — … — …

гаварыў — … — …



Спампавана з сайте aversev.by

*што зрабіў? — што зробіць?*
паслухаў *(пр. ч.)* — паслухае *(буд. ч.)*
паказаў — ...
адчыніў — ...

**188.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце дзеясловы. Вусна пастаўце да іх пытанні. У форме якога часу ўжыты ўсе дзеясловы ў тэксце?

Усе чакалі ў госці бабулю. Ірынка з мамай гатавалі святочны абед. Андрэйка з татам прыбіралі ў кватэры. Падарунак для бабулі з вечара стаяў на стале.

Пастаўце ўсе дзеясловы ў форму цяперашняга часу. Запішыце тэкст, які ў вас атрымаўся.

**Рм** Раскажыце, як у вашай сям'і сустракаюць гасцей.

**189.** Прачытайце каламбу́р. Спішыце. Знайдзіце ў сказе дзеясловы, вызначце іх час.

Зацікавіўся Цімошка: мушка лётае ці мошка? *(У. Мазго.)*

**каламбу́р** — ужыванне ў адным сказе падобных па гучанні слоў і спалучэнняў, якое выклікае ўсмешку

Якія словы ў сказе дапамаглі стварыць каламбур?


Спампавана з сайте aversev.by

**190.** Прачытайце верш. Якая пара года апісана ў ім? Па чым вы здагадаліся?

## Коцікі



Коцікі спалі
ў цесных каморках.
Ды ручаінкі
звіняць на **пагорках.**
Коцікі селі
на кусцік вярбовы,
грэюць на сонцы
жоўтыя бровы.

*Д. Бічэль.*

Спішыце. Знайдзіце дзеясловы, вусна пастаўце да іх пытанні. Вызначце час дзеясловаў.

❖ Разбярыце па саставе выдзеленае слова.

**191.** Прачытайце тэкст, вызначце яго тэму. Чым прываблівае птушак сцяжынка ў жыце?

## Сцяжынка ў жыце

Жыта ўжо ўвабра́лася ў сі́лу. З каласкоў сыпаўся жоўты пылок. Хутка збажына́ будзе налíва́цца.

На сцяжынцы ў жыце збірае сняданак заранка. Побач скача дрозд. Нават івалга з бярозавага гаю прыляцела сюды. Чаму сцежка так прыва́блівае птушак?



Спампавана з сайте aversev.by

Усё вельмі проста. Сцяжынку сонца награвае. Мошкі сюды выпаўзаюць да цяпла. Вось і ляцяць лясныя птушкі на сцяжынку ў жыце. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**увабра́лася ў сі́лу** — падрасло, закаласілася
**збажына́ налiва́ецца** — выспявае
**прыва́блівае** — вабіць (*рус.* приманивает)

Вусна пастаўце пытанні да дзеясловаў з тэксту, выпішыце іх у тры слупкі.

| *дзеясловы пр. ч.* | *дзеясловы цяп. ч.* | *дзеясловы буд. ч.* |
|---|---|---|
| ... | ... | ... |

**192.** Прачытайце. З кім параўноўваецца перапёлка ў вершы? Чаму?



Нібы жне́йка, перапёлка
ў поле **вы́бегла** на зо́лку.
Як сярпо́м, крылом **махае** —
збажыну жаць **запрашае**.
*А. Зэкаў.*

**жне́йка** — жняя́, жанчына, якая жне жыта сярпом
**зо́лак** — пачатак світання
**серп** — ручная прылада для жніва ў выглядзе паўкруглага нажа

Спішыце. Вызначце час выдзеленых дзеясловаў. Вусна пастаўце да іх пытанні.


Спампавана з сайте aversev.by

**193.** Прачытайце словы. У слупку справа пазнаёмцеся з прыметай, па якой трэба выбраць дзеясловы ў кожнай групе.

| | |
|---|---|
| 1. Бачыла, гучаў, любіць, ляцелі. | пр. ч. |
| 2. Чытае, рыхтуем, зробім, выступаюць. | цяп. ч. |
| 3. Будзе расці, вырасце, расцвіце, расцвіў. | буд. ч. |

Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго пісьмова.

**194.** Прачытайце загадку. Якое слова-адгадка «схавалася» за хмаркай? Вусна падбярыце да яго аднакаранёвыя словы.

Нехта ціха, мякка ходзіць,
нехта зноў павейкі зводзіць.
Сон чароўны прынясе.
Як яе завуць усе?

*У. Мацвеенка.*



Спішыце. Вусна пастаўце пытанні да дзеясловаў. Вызначце іх час, лік.

**195.** Прачытайце. У форме якога часу ўжыты ўсе дзеясловы ў тэксце?

Ціха шумяць сосны. Са зламанай галінкі бярозы сцякаюць на зямлю чыстыя кропелькі.



Спампавана з сайте aversev.by

Часцей стукае ў кару дрэва дзяцел. Спяваюць сініцы. У мурашніку **со*(н/нн)*ыя** мурашкі варушаць вусікамі. *(Паводле М. Даніленкі.)*

Пастаўце ўсе дзеясловы ў форму прошлага часу. Запішыце тэкст, які ў вас атрымаўся. Вызначце лік дзеясловаў.

❖ Разбярыце па саставе выдзеленае слова. Растлумачце яго правапіс.

## Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах

**196.** Дагаварыце дзеясловы прошлага часу ў сказах так, як патрабуе сэнс. У форме якога ліку ўжыты дзеясловы ў сказах?

(... ?)

Заспява.. прыгожая птушка.

(... ?)

Заспява.. галасісты салавей.

(... ?)

Заспява.. маленькае дзіця.

Спішыце. Вызначце род назоўнікаў у сказах. Пастаўце пытанні ад назоўнікаў да дзеясловаў.

**?!** Падумайце, чаму змяняецца дзеяслоў у сказах.

Вусна змяніце лік назоўнікаў з адзіночнага на множны. Вымавіце сказы, якія атрымаліся. Як змяніўся канчатак дзеяслова?


Спампавана з сайте aversev.by

Дзеясловы **прошлага часу** ў форме адзіночнага ліку змяняюцца **па родах.**

**197.** Разгледзьце табліцы змянення дзеясловаў прошлага часу адзіночнага ліку.

| Мужчынскі род |
|---|
| *хлопчык (ён)*<br>ш т о р а б і ў? *ішоў*<br>ш т о з р а б і ў? *паклікаў* |

| Жаночы род | Ніякі род |
|---|---|
| *дзяўчынка (яна)*<br>ш т о р а б і л а?<br>*ішла*<br>ш т о з р а б і л а?<br>*паклікала* | *дзіця (яно)*<br>ш т о р а б і л а?<br>*ішло*<br>ш т о з р а б і л а?<br>*паклікала* |

На якія пытанні адказваюць дзеясловы прошлага часу мужчынскага роду? Які суфікс яны маюць?

Якія дзеясловы прошлага часу адказваюць на адны і тыя ж пытанні? Які суфікс маюць дзеясловы прошлага часу жаночага і ніякага роду?

Пастаўце дзеясловы *ішоў, паклікаў* у форму прошлага часу множнага ліку. Запішыце. Абазначце ў іх суфіксы.



Спампавана з сайте aversev.by

Дзеясловы прошлага часу можна пазнаць па суфіксах. У форме адзіночнага ліку яны маюць суфіксы *-л-* (у жаночым і ніякім родзе), *-ў-* (у мужчынскім родзе). У форме множнага ліку яны маюць суфікс *-л-*.

**198.** Ад дадзеных дзеясловаў утварыце ўсе формы прошлага часу па ўзоры. Запішыце.

*Ве́сці — веў*☐ *(адз. л., м. р.), вял*[а] *(адз. л., ж. р.), вял*[о] *(адз. л., н. р.), вял*[і] *(мн. л.).*

Быць — …, жыць — …, пле́сці — …, ліць — … .

Вызначце лік дзеясловаў. У дзеясловаў адзіночнага ліку вызначце род.

Абазначце суфіксы дзеясловаў прошлага часу. Абазначце ў іх канчаткі.

**Гаварыце правільна!**

было́, былі́
жыло́, жылі́
ліло́, лілі́

**199.** Прачытайце сказы. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму прошлага часу.

У крывой вярбе *(будзе)* дупло вераб'ёў. Янка *(забярэ)* верабейку дамоў. Аднойчы маленькі



Спампавана з сайте aversev.by

верабейка *(выгляне)* з яго і *(зва́ліцца)* до́лу. Ён *(пашко́дзіць)* сабе ножку. Удзячныя вераб'і кожную раніцу *(вітаюць)* хлопчыка гучным чырыканнем. Ён *(корміць)* птушачку, пакуль ножка ў яе не *(зажыве)*. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**до́лу** — уніз
**пашко́дзіць** — параніць

Перачытайце сказы ў такой паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Запішыце апошні сказ тэксту. Падкрэсліце ў ім галоўныя члены.

**200.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць адну з іх.

1. Маланка пагро́зна
па хмарах скакала,
хмары пілою крывой
пілавала.

2. Грымнуў гром угары,
хлынуў лівень на двары.

*М. Пазнякоў.*

**пагро́зна** — *тут:* небяспечна

Выпішыце дзеясловы прошлага часу. Вызначце іх лік і род, абазначце суфіксы.



Спампавана з сайте aversev.by

**201.** Прачытайце. На каго падобна ноч у вершы?



## Зоры

Бе́гла **ночка** праз гушчар,
не́сла **зоркі** ў торбе хмар.
Напалохаў ноч камар,
з торбы высыпаўся жар.

*Д. Бічэль.*

Спішыце. У форме якога часу ўжыты ўсе дзеясловы ў вершы? Вызначце іх лік і род.

❖ Разбярыце па саставе выдзеленыя словы.

**202.** Прачытайце верш. Якое захапленне ёсць у Мілы?

## Акварыумныя рыбкі

У акварыуме Міла
рыбак кожны дзень карміла.
Ды ў акварыуме рыбкі
падрасталі штось не шыбка.

*А. Зэкаў.*

Колькі сказаў у вершы? Выпішыце з кожнага сказа дзейнік і выказнік. Вызначце час і лік дзеясловаў. У дзеяслова прошлага часу адзіночнага ліку вызначце род.

**Рм** Раскажыце, якія захапленні ёсць у вас.



Спампавана з сайте aversev.by

**203.** Ад дзеясловаў утварыце ўсе формы прошлага часу па ўзоры. Правільна прачытайце іх.

1. *Даць — даў — дала́ — дало́ — далі́.*
   Узяць — ... .
   Віць — ... .
2. *Бе́гчы — бег — бе́гла — бе́глі.*
   Кі́даць — кі́даў — ... .
   Не́сці — нёс — ... .

У дзеясловаў першай групы вызначце лік. У формах адзіночнага ліку вызначце род.

**204.** Утварыце сказы па стрэлках. Правільна прачытайце дзеясловы ў сказах.

Члены журы →
- далі́ заданне ўдзельнікам каманд.
- задалі́ пытанні капітанам.
- раздалі́ падарункі пераможцам.

Запішыце два сказы на выбар. Вызначце час і лік дзеясловаў.

**205.** Да кожнага дзеяслова падбярыце толькі той назоўнік, з якім дзеяслоў выкарыстоўваецца ў пераносным значэнні.

рака / дзяўчынка → спа́ла

хвіліны / дзеці → беглі



Спампавана з сайте aversev.by

песня → лілáся
вада → лілáся

чалавек → маўчаў
лес → маўчаў

Запішыце сказы, якія атрымаліся. Вызначце час і лік дзеясловаў. У дзеясловаў адзіночнага ліку вызначце род.

**206.** Замяніце кожнае ўстойлівае спалучэнне слоў блізкім па сэнсе дзеясловам з правага слупка.

| | |
|---|---|
| збіў з толку | успомнілася |
| падалá голас | стамілася |
| збілася з ног | засмяяліся |
| пакаціліся са смеху | маўчаў |
| трымаў язык за зубамі | заблытаў |
| усплыло ў памяці | адгукнулася |

Узор. *Збіў з толку — заблытаў, …*

З адным устойлівым спалучэннем слоў на выбар вусна складзіце сказ.

**207.** Прачытайце словы. Пазнаёмцеся з прыметамі, па якіх трэба выбраць дзеясловы ў кожнай групе.

| | |
|---|---|
| 1. Слухаў, дрыжала, сядзіць, цвіло, дыхаў. | пр. ч. |
| 2. Бачыў, смяяліся, весяліліся, гаварылі, думалі. | пр. ч., мн. л. |



Спампавана з сайте aversev.by

| | |
|---|---|
| 3. Чытаў, рыхтаваў, зрабіла, выступаў, паліваў. | пр. ч., адз. л., м. р. |
| 4. Прыне́сла, прыве́зла, сказала, убачыў, паела. | пр. ч., адз. л., ж. р. |
| 5. Было, жыло, ліло, пачала́, пачало. | пр. ч., адз. л., н. р. |

Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго пісьмова.

**208.** Прачытайце. У форме якога часу ўжыты ўсе дзеясловы ў тэксце?

Стаіць прыгожы дзень. Над полем узлятаюць чародкі шпакоў. Зямля дыхае спакоем. У небе ляціць само́тная павуцінка.

Над імша́рынай луна́е бусел. Міколка ведае яго. Бусел жыве на старой грушы. *(Паводле М. Лынькова.)*

**само́тная** — адзінокая
**імша́рына** — мохавае балота
**луна́е** — плаўна лётае

Пастаўце ўсе дзеясловы ў форму прошлага часу. Запішыце тэкст, які ў вас атрымаўся.

❖ Вызначце лік дзеясловаў. У дзеясловаў адзіночнага ліку вызначце род.


Спампавана з сайте aversev.by

## Правапіс *не* з дзеясловамі

**209.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Хто не працуе, таму не шанцуе.
Хто не сее, у таго не расце.
Рана не ўстанеш — многа не зробіш.

Знайдзіце ў прыказках дзеясловы. Як пішацца ***не*** з дзеясловамі? Запішыце прыказкі. Падкрэсліце ***не*** разам з дзеясловам.

Вусна ўтварыце новыя прыказкі ад прапанаваных, апусціўшы слова ***не***. Ці змяніўся сэнс выказванняў?

***Не*** з дзеясловамі **пішацца асобна.**

**210.** Прачытайце карысныя парады, якія можна даць вучням перад летнімі канікуламі.

1. Не сядзіце ўвесь час дома, многа гуляйце на вуліцы. 2. Не хадзіце адны на рэчку, рабіце гэта з дарослымі. 3. Не забывайце пра кнігі, чытайце іх у вольны час. 4. Не сядзіце без справы, прыдумайце сабе занятак на гэты час.

**Рм** Успомніце яшчэ некалькі парад. Дайце іх сваім аднакласнікам. Выкарыстайце дзеясловы з ***не***.

Запішыце любыя дзве парады на выбар. Падкрэсліце ***не*** разам з дзеясловам.


Спампавана з сайте aversev.by

**211.** Дапоўніце прыказкі патрэбнымі дзеясловамі з правага слупка. Чаму так гавораць?

| | |
|---|---|
| За доўгі язык ... . | *(не)*забываецца |
| Добрае слова ... . | *(не)*пахваляць |
| З песні слова ... . | *(не)*возяць |
| Праўду ... . | *(не)*закапа́еш |
| Дроў у лес ... . | *(не)*ломіць |
| Кашу маслам ... . | *(не)*выкінеш |
| Па́ра касцей ... . | *(не)*сапсуе́ш |
| Салаўя песнямі ... . | *(не)*накорміш |

**сапсава́ць** — пагоршыць (*рус.* испортить)

Спішыце тры прыказкі на выбар. Растлумачце правапіс ***не*** з дзеясловамі. Вызначце час дзеясловаў.

**212.** Прачытайце каламбур. Якія словы ў сказах дапамаглі стварыць яго?

Плылі́ на караблі
і трапілі на рыф мы.
*(Не)*бойцеся, калі
ўсё гэта дзеля рыфмы.
*У. Мазго.*



Растлумачце правапіс ***не*** з дзеясловам.

**рыф** — падводнае ці надводнае ўзвышэнне марскога дна, небяспечнае для караблёў



Спампавана з сайте aversev.by

**213.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце словы-адгадкі.

1. Плача і вые,
гуляе па полі.
Толькі ў рукі
*(не)*возьмеш ніколі.
*К. Камейша.*

в е е р ц

2. Цэлы дзень ён забаўляецца,
цэлы дзень за мной ганяецца,
а як толькі сонца зойдзе —
яго тады ніхто *(не)*знойдзе.
*У. Мацвеенка.*

е н ц ь

Спішыце адну загадку на выбар, раскрываючы дужкі. Вызначце час дзеясловаў.

**214.** Прачытайце жарт. Што выклікала ў вас усмешку? У прамым ці пераносным значэнні ўжыла бабуля дзеяслоў *скокні*?

Бабуля звяртаецца ***(да)*унука**:

— Мікітка, скокні ***(на)*двор**, ***(па)*глядзі**, ці дождж ідзе.

— Я, бабуля, так скакаць ***(не)*умею**, — сур'ёзна ***(ад)*казаў** Мікітка. *(М. Маскевіч.)*

Выпішыце выдзеленыя словы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс запісаных слоў.


Спампавана з сайте aversev.by

**215.** Прачытайце пары слоў. Як яны называюцца?

Рухацца — стаяць, маўчаць — размаўляць, палепшыць — пагоршыць, забараняць — дазваляць.

Ператварыце дзеясловы-антонімы кожнай пары ў блізкія па значэнні словы. Выкарыстайце слова ***не***.

Узор. *Рухацца — не стаяць, ...*

Запішыце. З адной парай блізкіх па значэнні дзеясловаў вусна складзіце сказы.

**216.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Садок пасадзіў — добрую справу зрабіў.
Хто ўвесну скача, той увосень плача.

Складзіце свае прыказкі, далучыўшы да дзеясловаў слова ***не***. Запішыце адну з прыказак, якая ў вас атрымалася.

**217.** Вусна дапоўніце спалучэнні слоў з левага слупка словам ***не***. Растлумачце іх значэнне, карыстаючыся словамі з правага слупка.

| | |
|---|---|
| ... адрываць вачэй<br>... зводзіць вачэй | не забываецца |
| ... выходзіць з галавы<br>... ідзе з думак | глядзець пільна, уважліва, не адрываючыся |

З адным з прыведзеных спалучэнняў на выбар складзіце і запішыце сказ.



Спампавана з сайте aversev.by

Выканайце інтэрактыўнае заданне.

**218.** Са слоў складзіце і запішыце прыказкі. Падкрэсліце ***не*** з дзеясловамі.

Праца, не, здароўя, адбірае.
Работы, не, словам, заменіш.
Праца, не, нікога, крыўдзіць.
Умеламу, не, рукі, баляць.
Пад, камень, ляжачы, не, вада, цячэ.
Рэшатам, не, вады, наносіш.

❖ Намалюйце схему першага сказа.

## Успомніце

З якімі часцінамі мовы вы пазнаёміліся?

**219.** Прачытайце. Што аб'ядноўвае словы ў кожнай групе?

1. Чорны, чарната, чарнець.
2. Весяліцца, вясёлы, весялосць.
3. Холад, халодны, халадаць.

Падзяліце словы на тры групы па іншай прымеце. Запішыце іх у тры слупкі. Што аб'ядноўвае словы ў кожным слупку?

Дапоўніце кожны слупок слоў уласнымі прыкладамі.



Спампавана з сайте aversev.by

**220.** Знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Запішыце астатнія словы кожнай групы. Вызначце прымету, якая аб'ядноўвае словы ў кожнай групе.

1. Птушка, песня, радасць, конь, печ.
2. Акуляры, дзверы, барацьба, штаны, канікулы.
3. Вясёлы, добрае, сонечны, дзянёк, прыгожая.
4. Бяжыць, слухаў, думае, глядзіць, смяецца.

Абазначце канчаткі назоўнікаў і прыметнікаў.

**221.** Прачытайце спалучэнні слоў. Выпішыце тыя з іх, якія напісаны па-беларуску.

Залаты медаль, золотая медаль; белая гусь, белый гусь; зелёный салат, зялёная салата; широкая степь, шырокі стэп; доўгі цень, длинная тень.

Вызначце род назоўнікаў.

?! Словы якой часціны мовы дапамаглі гэта зрабіць?

**222.** Прачытайце сказы. Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы.

1. У руках у таты была бліскучая **піла** (…). Таня **піла** (…) чай з прыгожага кубачка.

2. Тонкія **вусны** (…) рабілі твар настаўніцы крыху строгім. На ўроку дзеці рабілі **вусны** (…) пераказ тэксту.



Спампавана з сайте aversev.by

(...)
3. Бабуля **стала** каля пліты і пачала смажыць
(...)
бліны. Кошка ціха падышла да **стала**.

(...)
4. Снежань, студзень, **люты** — зімовыя месяцы. Трэба дапамагаць птушкам і жывёлам у
(...)
**люты** мароз.

(...)
5. У кветніку **Лілі** растуць прыгожыя ружы.
(...)
Летам дзеці часта **лілі** ваду пад пладовыя дрэвы.

Спішыце два сказы на выбар.

**223.** Спішыце, раскрываючы дужкі.

Наша вострая **піла** —
не **піла**, а пчала.
*(Не)***піла**, *(не)*ела,
ні разу *(не)*прысела,
а ўсё пела і гула́ —
вясёлая **піла**.
*В. Вітка.*



Пазначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы.

❖ Вусна вызначце час, род і лік дзеясловаў у вершы.


Спампавана з сайте aversev.by

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Адкажыце на пытанні*

1. Што такое назоўнік?
2. Як змяняюцца назоўнікі?
3. Як вызначыць род назоўнікаў?
4. Чаму ў назоўніка *паводзіны* нельга вызначыць род?
5. Што такое прыметнік?
6. Як змяняюцца прыметнікі?
7. Як вызначыць род і лік прыметнікаў?
8. Што такое дзеяслоў?
9. Як змяняюцца дзеясловы?
10. У форме якога часу дзеясловы змяняюцца па родах?
11. Як пішацца ***не*** з дзеясловамі?
12. Якую ролю ў сказе часцей выконваюць назоўнікі, якую — прыметнікі, а якую — дзеясловы?

### *Творчая хвілінка*

Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Часціны мовы ў беларускай мове». Выберыце любую з вывучаных часцін мовы і падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на тэму «Што я ведаю пра назоўнік (прыметнік, дзеяслоў)». Карыстайцеся інфармацыяй на форзацах вучэбнага дапаможніка.



Спампавана з сайте aversev.by

# ПАЎТАРЭННЕ

**224.** Прачытайце тэкст. Каго лічаць добрымі рыбакамі ў жывёльным свеце?



Сярод жывёл ёсць не толькі добрыя паляўнічыя, але і рыбакі. Ама́тарамі рыбалкі лічацца выдра, мядзведзь, чапля, бакла́н. Любяць паласавацца рыбкай бусел і жораў. Але ім шанцуе не так, як шэрай чаплі. Гэта птушка рыбачыць па-майстэрску. Яна доўга стаіць у вадзе каля берага і не варушыцца. Галаву чапля хавае між плячэй. Тырчыць толькі вострая дзюба. Пры з’яўленні рыбкі галава ўзнімаецца і імгненна знікае пад вадой. Праз секунду ў дзюбе ўжо трапечацца рыбка.

**ама́тар** — любіцель
**бакла́н** — вялікая вадаплаўная птушка

Пра што гэты тэкст? Якая яго асноўная думка?

Якія з прапанаваных загалоўкаў больш падыходзяць да тэксту: «Найлепшы рыбак сярод птушак», «На рыбалцы», «Рыбакі ў жывёльным свеце»?

На што ўказвае выбраны вамі загаловак: на тэму ці на асноўную думку?



Спампавана з сайте aversev.by

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы, абазначце ў іх корань.

Падзяліце тэкст на часткі. Карыстайцеся планам.

План
1. Жывёлы-рыбакі.
2. Чапля на рыбалцы.

Вусна перакажыце першую частку тэксту.

**225.** Прачытайце сказы. Расстаўце іх у патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

У гэты час ён часта ходзіць з бацькамі ў лес. Мікітка вельмі любіць лета. Сям'я збіраецца ў падарожжа на цэлы дзень. Мама бярэ з сабой ежу. У лесе яны знаходзяць маляўнічую палянку і адпачываюць там да вечара. Мікітка і тата складваюць у рукзак патрэбныя рэчы.

Спішыце першы сказ выпраўленага тэксту. Падкрэсліце ў ім галоўныя члены. Вусна пастаўце пытанні ад выказніка да іншых слоў у сказе.

**226.** Прачытайце тэкст. Чым адметны ліпень?

### Ліпень

У народзе кажуць: ліпень пяку́чы, але дару́чы. Сапраўды, гэта самы гарачы месяц лета. Ён дорыць чалавеку спелыя лясныя і садовыя ягады, гародніну.



Спампавана з сайте aversev.by

Ноччу з 6 на 7 ліпеня адзначаецца Купалле. Гэта народнае свята сонца і агню, вады і раслін. Да яго рыхтуюцца загадзя. Днём збіраюць зёлкі. Яны ў гэты час набываюць гаю́чую сілу. Ноччу паляць вогнішча, скачуць цераз яго, шукаюць папараць-кветку.



12 ліпеня — Пятроў дзень, старажытнае земляробчае свята. Раней яго таксама адзначалі гуляннямі з карагодамі, гушканнем на арэлях. Адна з прыказак гаворыць: «Святы́ Пятро жыта спеліць». Так у народзе заўважылі, што ў гэты час з'яўляюцца каласкі ў зла́ках.

**дару́чы** — *тут:* багаты на розныя дарункі
**зёлкі** — лекавыя травы
**гаю́чы** — здольны вылечваць хваробу

Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць?

План
1. Купалле.
2. Гарачы ліпень.
3. Пятроў дзень.

Спішыце частку тэксту, якая адпавядае малюнку.


Спампавана з сайте aversev.by

**227.** Прачытайце верш з патрэбнай інтанацыяй.

### Букет



Я дамоў прыйшла з букетам_
— Чым ён пахне, мама_
— Летам_

*В. Астаховіч.*

Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў.

**228.** Прачытайце тэкст. Вызначце ў ім віды сказаў па мэце выказвання.

Вось і настала лета. На лузе вабяць сваёй прыгажосцю кветкі. У лесе хутка з'явяцца суніцы. А як добра зараз на рэчцы! Купайцеся, сябры, загарайце, лавіце рыбу разам з дарослымі! Вуды і прылады для плавання ў вас падрыхтаваны? *(Па матэрыялах часопіса «Вясёлка».)*

Выпішыце клічныя сказы. У пабуджальным сказе падкрэсліце дзеясловы.

**229.** Прачытайце скорагаворкі. Назавіце ў іх галоўныя члены сказа. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.



1. Хвастом па вадзе водзіць
   вугор вёрткі.



Спампавана з сайте aversev.by



2. Цыбаў па балоце бацян цыбаты.

*А. Зэкаў.*

Запішыце сказ, які адпавядае схеме. Прачытайце яго з пытальнай інтанацыяй, з моцным пачуццём.




Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць запісаную скорагаворку.

Падбярыце сінонім да слова *бацян*.

**230.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Ці ўтвараюць яны тэкст?

У, жыта, чэрвені, каласуе.
Пачынаюць, суніцы, чырванець.
Пахне, канюшына, мёдам.
Замаўкаюць, спевы, птушыныя.
У, птушак, большасці, лясных, птушаняты, выведіся.
Клапатлівыя, носяць, і, мушак, бацькі́, у, гнёзды, чарвякоў.

Падкрэсліце ў першым сказе дзейнік і выказнік.
❖ Намалюйце схему гэтага сказа.


Спампавана з сайте aversev.by

**231.** Прачытайце. Якой вы ўявілі сабе сароку? Якая асаблівасць яе паводзін прыгадваецца ў вершы?

У сарокі-белабокі
церам **белы** і **высокі**.
На стале пяць этажэрак.
І на кожнай з іх — куфэрак.
У куфэрачках трашчоткі
ёсць навіны, ёсць і плёткі.
І разносіць іх сарока
недалёка і далёка.

*Н. Галіноўская.*



Знайдзіце і выпішыце антонімы. Падбярыце і запішыце антонімы да выдзеленых слоў.

**232.** Пазнаёмцеся са значэннямі слова *плётка* ў беларускай мове.

1. Плётка — кароткі бізун.
2. Плётка — ілжывая чутка.

Якое значэнне мае гэта слова ў вершы з практыкавання 231? Запішыце адпаведны сказ. Якое значэнне мае гэта слова ў рускай мове?

**233.** Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх сінонімы.

Вестка, пахучы, блізка, весць, навіна́, непадалёку, душысты, паведамленне, духмяны, недалёка, паблі́зу, водарны.

Запішыце кожную групу сінонімаў з новага радка.


Спампавана з сайте aversev.by

**234.** Прачытайце прыказкі. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго.

**Згода** збірае, ... растрасае. Лепш адзін ..., як дзесяць **ворагаў**. **Старую** рэч на ... змяняй ці хоць за плот кідай, **старога** сябра на ... не мяняй.

Словы для даведкі: *нязгода, прыя́цель, новую, новага*.

Перакладзіце слова *плот* на рускую мову, растлумачце яго значэнне.

**235.** Прачытайце вершаваныя радкі. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць іх. Ці спрытны смоўж на самай справе?

І ўпоперак, і ўдоўж
поўз па дрэве спрытны **смоўж**.
*У. Паўлаў*.

Запішыце сказ па памяці. Падкрэсліце ў ім антонімы. Падбярыце і запішыце сінонім да выдзеленага слова.

**236.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Што за кветачка такая
на вадзе зіхціць-гайдаецца:
днём на сонцы **загарае**,
уначы ў рацэ хаваецца?
*А. Зэкаў*.





Спампавана з сайте aversev.by

Спішыце загадку. Запішыце слова-адгадку. Падкрэсліце антонімы.

❖ У прамым ці пераносным значэнні ўжыта ў загадцы выдзеленае слова?

❖ Прыдумайце і запішыце сказ, у якім гэта слова будзе ўжыта ў прамым значэнні.

**237.** Прачытайце тэкст. У чым карысць суніц? Як трэба іх збіраць?

## Суніцы

Суніцы — смачныя і сакавітыя ягадкі. Яны з’яўляюцца ў лесе ў чэрвені. Збіраюць гэтыя ягады днём, калі прападае раса. Іх сушаць, з іх вараць варэнне. Высушаныя ягады — лекі ад многіх хвароб, а лыжачка сунічнага варэння заўсёды нагадвае пра лета.

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы, абазначце ў іх корань.

**238.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Чародкай невялічкай праходжваюць ля хаты індык з індычкай і індычаняты.

*М. Пазнякоў.*

Спішыце. Абазначце корань у аднакаранёвых словах. Знайдзіце прыстаўкі ў словах.



Спампавана з сайте aversev.by

**239.** Прачытайце верш. З кім параўноўваецца месяц? На што падобна неба ў вершы? Падбярыце сінонім да слова *муражок (мурог).*

### Месяц і зорачкі

Месяц, срэбны пастушок,
на жалейцы грае,
на нябесны **муражок**
зорачкі *(з/с)*бірае.
А як **сонейку** ўставаць —
гоніць іх а*(д/т)*пачываць.

*Г. Аўласенка.*

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары.

Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Для чаго аўтар выкарыстоўвае іх у вершы? Абазначце суфіксы ў выдзеленых словах.

**240.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Лё*(г/х)*ка *(с/з)*казаць, ды н*(е/я)*лёгка *(с/з)*рабіць. Шчыра *(с/з)*казана, як *(с/з)*вязана.

Спішыце, раскрываючы дужкі.

**241.** Прачытайце і адгадайце загадкі.

1. Між лугоў, л*(я/е)*соў уда́л*(я/е)*ч
стужка сіняя віе́цца.
І агонь яе *(не)***спаліць**,
і ніколі *(не)***парвецца**.





Спампавана з сайте aversev.by

2. **Ра*(з/с)*разала** далі
і скакала вес*(я/е)*ла,
кал*(е/я)*ровы ша́лік
між воблакаў **павесіла.**

*М. Пазнякоў.*



**уда́леч** — удалечыню (*рус.* вдаль)
**ша́лік** — *рус.* шарф

Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах.

❖ Знайдзіце ў загадках аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх корань.

**242.** Прачытайце верш. Якія колеры ў лета? Словамі якіх часцін мовы аўтар перадаў гэтыя колеры?

## Колеры лета

У вясёлкі колер лета!
Ну а ў лета — колер кветак,
колер возера і рэчкі,
колер верасу і грэчкі,
і малінавай дзялянкі,
і брусні́чнае палянкі,
і чароту, і чабору,
і зялёны колер бору...

*Г. Аўласенка.*



Спампавана з сайте aversev.by

Выпішыце з верша назоўнікі ў тры слупкі па ўзоры.

| | *м. р.* | *ж. р.* | *н. р.* |
|---|---|---|---|
| Узор: | *колер* | *вясёлка* | *лета* |
| | ... | ... | ... |

Выпішыце прыметнікі, разбярыце іх па саставе.

**243.** Прачытайце вершаваныя радкі. Падбярыце сінонімы да слоў у дужках так, каб захавалася рыфма.

1. Мы з сястрычкаю здзівіліся,
і здзіўленне без канца:
эльфы добрыя з’явіліся
на пушынках-(*адуванчыках*).

*В. Кажура.*

2. Бачны ў жыце ён здалёк,
наш блакітны (*валошка*).

*А. Зэкаў.*

Запішыце блізкія па сэнсе назоўнікі. Вызначце іх род.

**244.** Прачытайце і адгадайце загадку.



На адной сяджу і мару,
што ў другой куплю тавару.

*У. Мазго.*



Спампавана з сайте aversev.by

Якія значэнні мае слова-адгадка? Дапоўніце групы сінонімаў словам-адгадкай.

1. Магазін, крама, … .
2. Лава, услон, … .

Запішыце словы-сінонімы. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца? Вызначце іх род.

**245.** Прачытайце тэкст. Чым адметны першы месяц лета?

Прыгожы свет у чэрвені. Над зямлёй пасля цёплага дажджу ззяе вясёлка. У небе плывуць лёгкія аблачынкі. У агародзе паспелі духмяныя клубніцы. На сонечнай паляне просяцца ў вядзерца салодкія суніцы. З зялёнага моху выглядваюць жоўтыя лісічкі. *(Па матэрыялах часопіса «Вясёлка».)*

Выпішыце з тэксту прыметнікі разам з назоўнікамі, з якімі яны звязаны па сэнсе. Вызначце лік і род прыметнікаў.

**246.** Прачытайце. Якія радкі верша падказалі вам, што аўтар клапоціцца пра прыроду?

## Рамонкі

Цягнуцца да сонца
кветачкі малыя —
белыя пялёсткі,
вочкі залатыя.



Спампавана з сайте aversev.by

Тонкія сцяблінкі
ветрык абдымае.
Я не рву рамонкаў —
хай на сонцы ззяюць.
*Н. Сцепусь.*

Спішыце. Знайдзіце прыметнікі. Абазначце ў іх канчаткі і вызначце лік.

Які з прыметнікаў ужыты ў пераносным значэнні? Прыдумайце сказ, у якім гэты прыметнік будзе ўжывацца ў прамым значэнні.

**247.** Прачытайце прыказку і запомніце яе. Чаму так гавораць?

Ад добрага *(не)*уцякай і благога *(не)*рабі.

Спішыце, раскрываючы дужкі. Знайдзіце і падкрэсліце супрацьлеглыя па сэнсе прыметнікі.

**248.** Спішыце, раскрываючы дужкі. Вусна пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў. Абазначце лік прыметнікаў.

## Пчолка

Джала ў пчолкі, як іголка.
*(Не)*чапай мяне ты, пчолка!
А працуй: з духмяных кветак
мёд збірай для добрых дзетак.
*А. Лапошыч.*

❖ Назавіце ў вершы пабуджальныя сказы.


Спампавана з сайте aversev.by

**249.** Прачытайце. Якія словы дапамаглі вам уявіць лета гарэзлівай дзяўчынкай?

### Спявае лета



У стракатым сарафане
**скача** лета на паляне
сярод кветак і сунічак.
Запытайцеся ў крынічкі:
«Хто **спяваў** прыгожа гэтак?»
І яна **адкажа:** «Лета».

*Л. Багдановіч.*

Спішыце. Вызначце час і лік выдзеленых дзеясловаў. У дзеяслова прошлага часу вызначце род. У прамым ці пераносным значэнні ўжыты гэтыя дзеясловы ў вершы?

**250.** Прачытайце. Знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Запішыце астатнія словы. Назавіце прымету, якая аб'ядноўвае словы кожнай групы.

1. Ездзіў, чытаў, весяліліся, цячэ, гулялі.
2. Плавае, загарае, бегаюць, прынеслі, падарожнічаюць.
3. Пажартуе, адпачнуць, убачыць, наведаюць, растуць.

**Рм** Раскажыце, якія прыемныя заняткі чакаюць дзяцей летам. Выкарыстайце запісаныя дзеясловы.



Спампавана з сайте aversev.by

**251.** Прачытайце жарт. Што выклікала ў вас усмешку?

— Ты рукі **мыла**?
— **Мыла**! Але без **мыла**.
— А ці чыста памыла?
— Паглядзі на ручнік.

*У. Содаль.*

Якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы? Выпішыце дзеясловы прошлага часу, абазначце суфіксы, вызначце лік.

**252.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

На, цень, ад, дрэва, ляжаў, вадзе.
Па, возеры, гусь, белая, плыла.
Да, падышоў, вады, сабака, вялікі.
Сонечныя, ляжалі, на, акуляры, матулі, паліцы.

Якой часцінай мовы з'яўляюцца дзейнікі ў сказах? Вызначце іх род і лік.

**253.** Прачытайце слоўнікавыя словы ў крыжаванцы. Якія літары пішуцца ў іх на месцы пропускаў?

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | п | а | ? | у | к | | в | |
| | | | | | | | ? | | | я | | | | | | ы | |
| | | | | | | | ш | ч | а | ? | ц | е | | п | | ? | |
| | | | | | | | ы | | | ч | | | | ? | | с | |
| | | | | п | о | ? | т | а | | а | ? | ч | ы | н | і | ц | ь |
| | | | | | | | а | | | н | | | | а | | і | |
| в | о | с | е | н | ? | с | к | і | | ы | | | | л | | | |



Спампавана з сайце aversev.by

**254.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Якія дзеясловы дапамаглі вам знайсці адгадкі?



1. **Бяжыць і *(не)*спыняецца,**
   **ніколі *(не)*стамляецца.**
2. **Не конь, а пасецца,**
   **у рукі *(не)*даецца.**

***У. Карызна.***

Спішыце загадкі, раскрываючы дужкі. Вызначце час і лік дзеясловаў.

**255.** Прачытайце скарагаворку. Навучыцеся хутка і правільна яе вымаўляць.

Заві́тала зебра да зубра́,
зебра зубру зы́чыла дабра.

*В. Жуковіч.*

**завіта́ла** — наведала, праведала
**зы́чыла** — *тут:* жада́ла

Запішыце скарагаворку па памяці. Знайдзіце ў ёй дзеясловы прошлага часу. Вызначце іх лік і род.

**Рм** Прыдумайце падобную скарагаворку, замяніўшы слова *зебра* на слова *заяц*. Як змяніліся дзеясловы ў ёй?



Спампавана з сайте aversev.by

# Слоўнікавыя словы

адцвіта́ць
адчыні́ць
асцяро́жны
блішча́ць
булён
бутэрбро́д
во́блака
во́сеньскі
ву́лей
вы́йсці
гарадскі́
гасці́нец
дзённік
звіне́ць
паву́к
пена́л
по́шта
пясча́ны
свяці́ць
смяя́цца
сшы́так
шча́сце

Спіс выкарыстаных крыніц


Спампавана з сайте aversev.by

# Змест

## СЛОВА

**Склад слова** ........ 3
Прыстаўка ........ 3
Суфікс ........ 29
*Праверце сябе* ........ 43

**Часціны мовы** ........ 44
Назоўнік ........ 47
Адзіночны і множны лік назоўнікаў ........ 52
Род назоўнікаў ........ 61
Прыметнік ........ 78
Змяненне прыметнікаў па родах ........ 81
Змяненне прыметнікаў па ліках ........ 89
Дзеяслоў ........ 95
Адзіночны і множны лік дзеясловаў ........ 100
Час дзеясловаў ........ 104
Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах ........ 110
Правапіс ***не*** з дзеясловамі ........ 118
*Праверце сябе* ........ 125

**Паўтарэнне** ........ 126

Слоўнікавыя словы ........ 142



Спампавана з сайте aversev.by

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Свірыдзенка** Вольга Іванаўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках
Частка 2

2-е выданне, перагледжанае і дапоўненае

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Н. М. Мамчыц*
Мастакі *Д. М. Матарыкін, Н. А. Хромава, Л. А. Мурашка, А. М. Брыкет, Н. В. Музычэнка*
Вокладка мастака *Ю. М. Галавейка*
Мастацкі рэдактар *В. М. Горбач*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктары *Г. М. Мазіна, Н. В. Федарэнка*

Падпісана да друку 25.08.2023. Фармат 70×90/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 10,53. Ул.-выд. арк. 4,7. Тыраж 135 232 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Спампавана з сайте aversev.by

# СКЛАД СЛОВА

*прыстаўка* *корань* *суфікс* *канчатак*

**падказка**

### Формы слова

прыехаў (*хто?*) **сябар**
не заўважылі (*каго?*) **сябра**
радаваліся (*каму?*) **сябру**
убачылі (*каго?*) **сябра**
развіталіся (*з кім?*) з **сябрам**
сумавалі (*па кім?*) па **сябру**

### Аднакаранёвыя словы

**праўда**
**праўдзівы**
ня**праўда**
са**праўдны**

# ЧАСЦІНЫ МОВЫ

| назоўнік | прыметнік | дзеяслоў | прыназоўнік |
|---|---|---|---|
| абазначае прадмет | абазначае прымету прадмета | абазначае дзеянне прадмета | служыць для сувязі слоў у сказе |
| *хто?*<br>*што?* | *які?*<br>*якая?*<br>*якое?*<br>*якія?* | *што робіць?*<br>*што робяць?*<br>*што рабіў?*<br>*што зрабіў?*<br>*што будзе рабіць?*<br>*што зробіць?* | **у, на, над, з, за, з-за, да, ад, па, пад** |

назоўнік: мае **род**; змяняецца па **ліках**

прыметнік: змяняецца па **родах** і **ліках**

дзеяслоў: змяняецца па **ліках**; можа перадаваць **час** дзеяння

# НАЗОЎНІК

### Лік назоўнікаў

| адзіночны | множны |
|---|---|
| *дом* | *дамы* |
| *крэйда* | *нажніцы* |






**у рускай мове**
*крупа* → адз. л.
**у беларускай мове**
*крýпы* → мн. л.



### Род назоўнікаў

| мужчынскі<br>*ён, мой* | жаночы<br>*яна, мая* | ніякі<br>*яно, маё* |
|---|---|---|
| *пенал* | *кніга* | *воблака* |





**у рускай мове** / **у беларускай мове**



*сабака* → м. р.
ж. р. ← *собака*



ж. р. ← *медаль* → м. р.



*кацяня* → н. р.
м. р. ← *котёнок*

### Нельга вызначыць род!





*шахматы* *санкі* *акуляры*

# ПРЫМЕТНІК

## Змяняецца па ліках

| Адзіночны лік | | |
|---|---|---|
| мужчынскі род | жаночы род | ніякі род |
|  |  |  |
| *новы сіні* | *новая сіняя* | *новае сіняе* |

**Множны лік**



*новыя сінія*

**Не змяняецца па родах**

## Роля ў сказе

| Назоўнік | | Прыметнік | Дзеяслоў |
|---|---|---|---|
| дзейнік | даданы член сказа | даданы член сказа | выказнік |

*Дзеці радуюцца сонечнаму надвор'ю.*

# ДЗЕЯСЛОЎ

## Змяняецца па ліках

| адзіночны лік | множны лік |
|---|---|
|  |  |
| *ідзе* | *ідуць* |

## Перадае час дзеяння

| прошлы | цяперашні | будучы |
|---|---|---|
|  |  |  |
| *ішоў* *прайшоў* | *ідзе* | *будзе ісці* *пойдзе* |

**Змяняецца па родах**

|  |  |  |
|---|---|---|
| м. р. *ішоў* | н. р. *ішло* | ж. р. *ішла* |